ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАЇН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 51 (2104)
24 чэрвеня 1966 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

На Гомельшчыне паспяхова будуюцца новыя асфальтаваныя дарогі Брагін—Холмеч, Гадзілавічы—Гарадзец—Столпня. Гомельскі абком КПБ і аблвыканком пачалі аб'ядноўваць сілы і сродкі калгасаў, саўгасаў, прадпрыемстваў і арганізацый, прызначаныя на дарожнае будаўніцтва, што значна паскорыла справу.

Гэтыя прыклады прыводзіліся на восьмай сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР шостага склікання, якая адбылася ў Мінску 22—23 чэрвеня г. г. Выбраннікі беларускага народа абмяркоўвалі важнае, вельмі надзённае пытанне — аб стане і мерах па паляпшэнню будаўніцтва і ўтрымання дарог у рэспубліцы.

Адзначаліся значныя поспехі ў гэтай справе. Так, даўжыня дарог з цвёрдым пакрыццём павялічылася за сямігоддзе на 6 600 кіламетраў, што ў 1,3 раза больш, чым было пабудавана за папярэднія 15 год.

У новай пяцігодцы ў дарожную гаспадарку будзе ўкладзена каля 355 мільёнаў рублёў, што ў паўтара раза перавышае ўкладанні за папярэдняе пяцігоддзе.

Гэта поспехі, гэта рэальныя планы... Разам з тым народныя выбраннікі пра многае гаварылі з трывогай і заклапочанасцю. Не ўсе кіраўнікі гаспадарак і дзяржаўных органаў улічваюць, што добрая аўтамабільная дарога — гэта сэканомленыя сродкі ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, гэта зберажоная тэхніка, гэта паляпшэнне быту і культурнага абслугоўвання насельніцтва. У многіх месцах дарогі знаходзяцца ў закінутым стане. Толькі 45 працэнтаў дарог абласнога значэння маюць цвёрдае пакрыццё, мясцовых жа і таго менш — 11 працэнтаў.

Рашэнні сесіі накіраваны на рашучае паляпшэнне дарожнай гаспадаркі.

Акрамя гэтага пытання сесія абмеркавала выкананне Дзяржаўнага бюджэту Беларускай ССР за 1965 год і зацвердзіла Указы Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

ДЛЯ АДПАЧЫНКУ МІНЧАН

Ужо з суботы на ўсіх выездах з Мінска можна сустрэць рыбакоў, турыстаў. Едуць на матацыклах, веласіпедах, грузавіках, на легкавых машынах. А ў нядзелю з раніцы пачынаецца «вялікае перасяленне» сталіцы. Машыны па магістралях ідуць патокам, ва ўсе канцы імчаць пасажырскія цягнікі, электрычкі. Ажываюць лесапаркі, прыгарадныя лясы, азёры, рэчкі, лугі. Горад дыхае свежым паветрам.

Для лепшай арганізацыі адпачынку працоўных прадугледжаны пэўныя маршруты аўтобусаў, таксі, цягнікоў, згодна з генеральным планам добраўпарадкоўваюцца прыгарадныя зоны. Апошні генеральны план вызначыў мяжу прыгараднай зоны Вялікага Мінска. Яна праходзіць на поўнач ад Астрашыцкага Гарадка, на ўсходзе дасягае Смалявіч, на поўдні ідзе за Міханавічамі і Русінавічамі, на паўднёвым захадзе праходзіць за Воўчкавічамі і Старым Сялом, накіроўваючыся да Ракава, агінае з захаду лясныя масівы гэтага сяла, ідзе на поўнач, агінае з захаду Радашковічы, падымаецца на дзесятак кіламетраў на поўнач, а потым рэзка паварочвае на поўдзень да Заслаўя, да рэчкі Вячы.

Прыродныя ўмовы ў гэтых месцах у асноўным прыдатныя для адпачынку. У прыгарадных лясах шмат ягад і грыбоў, рыбакі ад світання да позняй ночы сядзяць на берагах рэк. Зімою з крутых схілаў пагоркаў спускаюцца лыжнікі. Але ў нас, на жаль, побліз горада няма вялікіх рэк, азёр. У ніжняй плыні Свіслач забруджана сцёкавымі водамі. У ёй нельга купацца. Берагі многіх невялікіх рэк забалочаны. Ды і саміх гэтых рэк пад Мінскам не гэтак ужо многа. Каб даць магчымасць людзям добра адпачываць ля вады, новы генеральны план прадугледжвае стварэнне новых вадасховішчаў.

У нас ёсць Заслаўскае вадасховішча (Мінскае мора) і Камсамольскае возера на рацэ Свіслач, ля Воўчкавічаў на рацэ Пціч таксама ёсць невялікі вадаём на 80 гектараў. На чарзе стварэнне двух вадасховішчаў на рацэ Вячы ля вёскі Мачаны (плошчаю ў 160 гектараў) і ля вёскі Паперня (прыкладна такое ж). На Пцічы ў раёне Русінавіч прадугледжваецца стварэнне вадаёма плошчаю да 200 гектараў. На рацэ Свіслач ля вёскі Дразды праектуецца новае возера, якое будзе большае за Камсамольскае. На Волме непадалёку ад піянерскіх лагераў будуць два вадасховішчы. На рацэ Усяж з'явіцца водная гладзь у маляўнічым месцы непадалёку Усяжа. Але самай значнай будзе Вілейска-Мінская водная сістэма. Ваду Віліі падымуць на водападзел, а адсюль яна ўвальецца ў Свіслач, якая стане паўнаводнай. Не забыта і прыгажуня Лошыца, тут будзе пабудавана новая плаціна. Ужо ёсць праект вадасховішча, яно з'явіцца праз пару гадоў. Заслаўскае вадасховішча намечана ў бліжэйшы час палепшыць — стварыць побач з ім буфернае вадасховішча там, дзе рака Ратамка ўпадае ў «мора». У гэтай зоне будзе ўзняты ўзровень вады, астравы злучацца намыўной дамбай з новымі пясчанымі пляжамі, балоты будуць ліквідаваны пры дапамозе гідраўлічнай тэхнікі. Калі мы ўсё гэта выканаем, агульная плошча воднай паверхні ля Мінска, паводле папярэдніх падлікаў, складзе каля шасці тысяч гектараў.

Другая наша задача — узбагаціць рэльеф мясцовасці пасадкаю дэкаратыўных дрэў і кустоў ля «затрыманай» вады, разбіць пляжы і спартыўныя пляцоўкі.

Пад Мінскам з'явяцца новыя асфальтаваныя дарогі, якія прывядуць да новых месц адпачынку, будуць пастаўлены ля дарог розныя будынкі архітэктуры малых форм. Ля Мінскага мора будуць створаны некалькі новых піянерскіх лагераў, дом адпачынку, санаторый, дзве турысцкія базы. Будуецца гасцініца «Юнацтва» ля вёскі Ганалес, студэнцкі пансіянат.

Пад Мінскам узнікнуць і іншыя ўстановы для адпачынку, якія на суботу і нядзелю або нават на месячны тэрмін прымуць тысячы жыхароў сталіцы. Праз некалькі гадоў наша прыгарадная зона непазнавальна зменіцца.

С. ЛАПУРКА,
старшы архітэктар Упраўлення па справах будаўніцтва і архітэктуры Мінскага гарвыканкома.

26 ЧЭРВЕНЯ — ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ МОЛАДЗІ

Кожны чалавек ведае казачна-чароўную краіну пад назвай Маладосць. Краіну радасці, прыгажосці, узнёслых надзей, першых здзяйсненняў. Адна з сённяшніх жыхарак гэтай краіны — Наталля Асташкевіч, студэнтка Мінскага будаўнічага тэхнікума.

Фота С. АНАНКІ.

З ВІЗІТАМ У АДКАЗ

Добрыя ўражанні засталіся ў беларускіх аматараў мастацтва ад групавой выстаўкі твораў мастакоў Азербайджана, якая нядаўна гасцявала ў Мінску. У парадку абмену Саюз мастакоў БССР паслаў у Азербайджан групавую выстаўку твораў мастакоў нашай рэспублікі. Яна адкрылася ў сталіцы Азербайджана Баку 15 чэрвеня.

На выстаўцы прадстаўлены станковая і кніжная графіка (гравюры, лінагравюры, ілюстрацыі, акварэлі) А. Паслядовіч, Д. Кашкурэвіча, Г. Паплаўскага, А. Лось, В. Цяхановіча, Б. Заборава, А. Тычыны, Л. Асецкага, Г. Вашчанкі, С. Геруса і іншых. На адкрыцці выстаўкі госцем азербайджанскіх мастакоў і аматараў выяўленчага мастацтва быў Георгій Паплаўскі.

ПОМНІКІ СТАРАЖЫТНАСЦІ І СУЧАСНАСЦЬ

16—17 чэрвеня Саюзам архітэктараў СССР была праведзена нарада «Сучасны горад і помнікі архітэктуры». Ніжэй мы публікуем артыкул сакратара праўлення Саюза архітэктараў СССР Юрыя Яралава, у якім ён асвятляе некаторыя пытанні аховы і сённяшняга выкарыстання помнікаў старажытнасці.

Размова аб ролі і месцы помнікаў архітэктуры ў сучаснай забудове гарадоў мае не вузка акадэмічную або тэарэтычную цікавасць. Імклівы рост нашых гарадоў, цяжкасці, звязаныя з гэтай з'явай, і, у прыватнасці, усё больш частыя выпадкі рэканструкцыі і будаўніцтва ў старых раёнах—усё гэта вызначае актуальнасць праблемы.

Помнік — не толькі слаўная гісторыя. Гэта—актыўны кампанент сучаснасці. Гэта непарыўна звязаны з ёю нерв жыцця, мост, перакінуты ад мінулага да сучаснасці. Без мінулага няма цялерашняга, без гісторыі няма перспектывы, няма будучыні, няма традыцый, г. зн. таго, што вызначае духоўнае і культурнае багацце народа.

Да помнікаў патрэбны не захапляльна-сузіральныя адносіны, а актыўнае дзеянне. Мы супраць нігілізму адвяргальнікаў мінулага, але мы супраць і тых прыхільнікаў старажытнасці, якія гатовы пасадзіць гарады пад шкляныя каўпакі, баючыся жывога дыхання сучаснасці, якая патрабуе разумнага і мудрага спалучэння новага і старога.

У паняцце «помнік» могуць і павінны ўваходзіць не толькі гістарычныя, але і нашы савецкія збудаванні. Тое, што сёння — сучаснасць, заўтра—гісторыя. Мы ўжо маем багатую падзеямі, супярэчлівую, але вельмі змястоўную гісторыю савецкай архітэктуры, вехі якой адзначаны своеасаблівымі творамі. Будынкі і ансамблі, створаныя бр. Веснінымі, Гінзбургам, Мельнікавым, Ладоўскім, Шчусевым, Жалтоўскім, Таманянам, Шчуко, Гельфрэйхам, Белагрудам, Троцкім, Левінсонам і Фаміным і многімі сённяшнімі майстрамі, — гэта ўсё слаўная гісторыя савецкай архітэктуры.

У галіне захавання і аховы помнікаў зроблена нямала. Удала ўключаны ў планіроўку цэнтра горада Астраханскі крэмль. З вялікай тактоўнасцю спалучаецца новая забудова са старажытнымі помнікамі Баку. Тактоўна выканана новая забудова ў раёне Нова-Дзевіччага манастыра ў Маскве.

Ва ўсіх гэтых і многіх іншых выпадках архітэктары-гарадабудаўнікі і рэстаўратары, працуючы ў творчай садружнасці, здолелі ўлічыць інтарэсы як аховы помнікаў, так і новай забудовы.

Тады толькі і можна гаварыць пра майстэрства архітэктара-гарадабудаўніка, калі ён знаходзіць правільныя рашэнні, якія гарманічна спалучаюць інтарэсы старога і новага, без ушчамлення інтарэсаў таго і другога.

Гістарычна апраўданай з'яўляецца прымаўка «Што горад, тоноў». І сапраўды, няма двух гарадоў-блізнят, бо канкрэтныя фактары, якія ўплываюць на ўмовы жыцця і росту горада (прыродныя, кліматычныя, вытворчыя і іншыя), вызначаюць своеасаблівасць і непаўторнасць умоў, у якіх жывуць і развіваюцца гарады.

Іменна ў гэтай непаўторнай унікальнасці аблічча заключана прыгажосць і каштоўнасць кожнага горада. Таму і мае такое вялікае значэнне майстэрства ўключэння помнікаў архітэктуры ў новую забудову.

У Маскве, Ленінградзе, Кіеве, Тбілісі, Рызе, Таліне ёсць і цэлыя гістарычныя ансамблі — у Маскве, Петрапаўлаўская крэпасць у Ленінградзе, Сафійскі сабор у Кіеве, Метэхскі замак у Тбілісі і асобныя выдатныя помнікі архітэктуры, раскіданыя па тэрыторыі гарадоў. Такіх гарадоў у нашай краіне шмат, і таму пытанне суіснавання ў іх старажытнасці і сучаснасці з'яўляецца вельмі актуальным.

Другім тыпам могуць быць названы гарады - запаведнікі, калі гістарычная забудова займае ў горадзе вядучае месца. Гэта, напрыклад, Суздаль, Хіва, Бухара, Мцхета, Эчміадзін і іншыя. У такіх гарадах любая рэканструкцыя можа прывесці да непапраўных страт, таму трэба асабліва асцярожна падыходзіць да размяшчэння ў іх новых будынкаў і кварталаў.

І, нарэшце, трэці тып гарадоў, як, напрыклад, Кастрама, Пераяслаўль-Залескі, Растоў Вялікі, дзе няма буйных горадаўтваральных фактараў, такіх, як прамысловасць, вялікія інстытуты. У іх помнікі па сутнасці вызначаюць архітэктурнае аблічча, а іх захаванасць — не толькі культурнае, але і гаспадарчае жыццё горада, бо цікавыя помнікі заўсёды вабяць турыстаў.

Для арганічнага ўключэння помнікаў архітэктуры ў сучасную забудову гарадоў трэба стварыць вакол іх ахоўныя, а іншы раз і забаронныя зоны, якія вызваляюцца ад пабочных будынкаў і не падлягаюць забудове.

Помнікам, якія захавалі свае інтэр'еры, трэба знаходзіць такое прызначэнне, якое забяспечвала б не толькі захаванасць інтэр'ераў, але і магчымасць іх паказу. Найбольш адпавядае гэтым патрабаванням выкарыстанне такіх будынкаў пад музей (стары сабор Данскога манастыра ў Маскве — музей рускай архітэктуры, Казанскі сабор у Ленінградзе —музей гісторыі рэлігіі і атэізму і іншыя). Вядома, для захавання інтэр'ераў размяшчэнне музея ў помніку архітэктуры не абавязкова. Так, цэрквы зручныя для аўдыторый і канцэртных залаў (Домскі сабор у Рызе — канцэртная зала арганнай музыкі, маскоўская царква Пакрова ў Рубцове — рэпетыцыйная зала пеўчай капэлы). Асноўным правілам для захавання помнікаў у гэтым выпадку павінна быць: новае выкарыстанне прыстасоўваецца да помніка, не скажаючы яго.

Нарэшце, хочацца прааналізаваць праблему выкарыстання помнікаў яшчэ з аднаго і вельмі істотнага боку.

Турызм перажывае незвычайны ўздым ва ўсім свеце. За апошнія гады замежны турызм стаў значнай з'явай і ў жыцці нашай краіны. Адной з найбольш прыцягальных сіл для падарожнікаў усіх краін служаць помнікі гісторыі, культуры і мастацтва.

Таму заўсёды трэба памятаць аб тым, што помнік пры ўмове яго правільнага выкарыстання можа прыносіць дзяржаве вялікі даход.

...Што мы лічым патрэбным зрабіць сёння?

Неабходна стварыць адзіны дзяржаўны цэнтр па ахове помнікаў архітэктуры; аб'яднаць разрозненыя цяпер навукова-рэстаўрацыйныя майстэрні пад кіраўніцтвам адзінага навукова-даследчага цэнтра па вывучэнню, ахове і рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры; стварыць адзіны ўсесаюзны навукова-метадычны цэнтр; паставіць на навуковую комплексную аснову пытанні аднаўлення помнікаў архітэктуры, спалучаючы іх з вырашэннем праблем добраўпарадкавання і арганічнага ўключэння новых аб'ектаў у гістарычную забудову.

Я ўпэўнены, што назваў далёка не ўсе праблемы і ўпамянуў далёка не ўсе характэрныя прыклады вырашэння задач уключэння помнікаў архітэктуры ў сучасную забудову гістарычна склаўшыхся гарадоў. Думаю, што гэта і немагчыма ў кароткім артыкуле.

Я хачу закончыць яго зваротам ЮНЕСКО ў сувязі з Міжнародным годам абароны помнікаў, які праводзіўся ў 1964 годзе: «Мы жывём ў той час, калі не трэба больш разбураць, каб ствараць, і калі можна ўключыць у самыя смелыя планы будучыні павагу да спадчыны мінулага, калі ёсць сродкі аблегчыць дыялог сучаснага чалавека з вялікімі творамі сваіх продкаў».

Юрый ЯРАЛАЎ,
сакратар праўлення Саюза архітэктараў СССР.

МІЖНАРОДНЫ ІМЯ ЧАЙКОЎСКАГА

ПЕРАД ФІНІШАМ

На Міжнародным конкурсе імя П. І. Чайкоўскага ў Маскве вызначыліся першыя пераможцы. Вось імёны, якія назвала журы конкурсу віяланчэлістаў:

I прэмія — Карынэ Геаргіян (СССР).

II прэмія — Стэфан Кейтс (ЗША), Арта Норас (Фінляндыя).

III прэмія — Элеанора Цесцялец (СССР), Кен-Іціра Ясуда (Японія).

IV прэмія—Ларэнц Лесер (ЗША).

V прэмія — Тамара Габарашвілі (СССР).

VI прэмія—Міхаіл Майскі (СССР).

Ганаровымі дыпломамі ўзнагароджаны: Кардэлія Вікарскі (ГДР), Стэфан Папоў (Балгарыя), Натаніель Розен (ЗША), Марка Скана (Італія), Марыя Чайкоўская (СССР).

Вынікі конкурсу скрыпачоў такія:

I прэмія — Віктар Траццякоў, (СССР).

II прэмія — Алег Каган (СССР), Масука Усіода (Японія).

III прэмія — Алег Крыса (СССР), Ёка Сата (Японія).

IV прэмія — Ніколас Чумачэнка (Аргенціна).

V прэмія — Зіновій Віннікаў (СССР).

VI прэмія — Рубен Агаранян (СССР), Эрык Фрыдман (ЗША).

VII прэмія — Чарльз Каслмен (ЗША).

Ганаровыя дыпломы: Эмі Верхей (Галандыя), Войцех Глінка (Чэхаславакія), Антуан Гулар (Францыя), Эвеліо Цьелес (Куба).

Скончаны толькі адзін этап конкурсу, другі—ў поўным разгары.

У вакалістаў у групу пераможцаў першага туру трапілі ў асноўным спевакі Савецкага Саюза, Балгарыі і ЗША. У піяністаў — больш шырокі склад «лідэраў». Другі тур у спевакоў і піяністаў закончыўся 22 чэрвеня. Наперадзе — трэці, апошні, пасля якога стануць вядомыя імёны новых лаўрэатаў.

662 І ЯШЧЭ АДНО ІНТЭРВ'Ю

У пачатку сёлетняга года большасць раённых аддзелаў культуры Гомельскай вобласці распаўсюдзіла сярод насельніцтва анкету «Культуру для ўсіх будуе кожны». У ёй дзевяць пытанняў: дзе і як вы праводзіце свой вольны час; ці часта бываеце ў клубе і як ацэньваеце яго работу; якім вы хацелі б бачыць свой клуб і іншыя. Дзевяць пытанняў — дзевяць адказаў, напісаных калгаснікамі і рабочымі саўгасаў, настаўнікамі і вучнямі, спецыялістамі сельскай гаспадаркі. Гэта вялікі матэрыял для роздуму, аналізу, пошукаў шляхоў паляпшэння работы культасветустаноў.

Я ўзяў наўздагад адну з папак. У іх ляжаць 662 анкеты з васьмі клубаў Чачэрскага раёна. І першы ж, беглы агляд іх пераканаў, што людзі вельмі сур'ёзна, удумліва паставіліся да адказаў на прапанаваныя ім пытанні. Тут шмат цікавых заўваг, слушных думак і шырокіх прапаноў сваёй дапамогі. Я запісаў гэтыя клубы сабе ў блакнот, каб потым абавязкова там пабываць, паглядзець, як памаглі клубным работнікам пажаданні наведвальнікаў і як клубы перабудоўваюць сваю работу. Але гэта— праз некалькі месяцаў.

А цяпер — анкеты.

Бадай, лепш за ўсё выказаў думкі ўсіх, каму прапанавалі адказаць на пытанні, калгаснік Мікалай Яўстратавіч Багдановіч (Струменскі сельскі клуб). Ён напісаў: «Уся работа клуба залежыць ад нас...», а на пытанне: «Якім вы хацелі б бачыць свой клуб?», — адказаў: «Хочацца, каб ён меў гарадскі выгляд».

Што ж разумеюць людзі пад гэтым — «уся работа клуба залежыць ад нас...»

У першую чаргу — самы шырокі ўдзел грамадскасці ў дзейнасці клуба. Поспех культмасавай работы на вёсцы, вядома, у першую чаргу залежыць ад загадчыка клуба. Але нават самы ініцыятыўны і кваліфікаваны работнік адзін наўрад ці справіцца з усімі задачамі, якія стаяць сёння перад культасветустановай. Анкеты, атрыманыя з Чачэрскага раёна, пераконваюць, што людзі ахвотна гатовы прыйсці на дапамогу культармейцу.

«Хачу ўдзельнічаць у мастацкай самадзейнасці», — пішуць бухгалтар М. Міроненка, медработнік Ганна Клапкова і многія іншыя.

А чаму гэтыя людзі да гэтага часу не ўдзельнічалі ў самадзейнасці? Адказ знаходжу ў анкетах. «Хачу ўдзельнічаць у рабоце музычнага гуртка, але такога няма ў нас»,—піша Валерый Парфёнаў.

Уся бяда, відаць, у тым, што няма кіраўніка. У сельскіх установах культуры па-ранейшаму не хапае кваліфікаваных кадраў. Ніхто пакуль не можа прыгадаць выпадак, каб выпускнік музычнага вучылішча пайшоў працаваць у сельскі клуб, уклад культасветвучылішчаў таксама нязначны. Курсы пры абласным Доме народнай творчасці? Практыка паказала, што некалькі дзесяткаў іх выпускнікоў не могуць вырашыць праблемы. На Гомельшчыне 1.180 клубаў і дамоў культуры, да 50-годдзя Савецкай улады іх будзе на дзвесце больш. У Буда-Кашалёўскім, Нараўлянскім, Веткаўскім, Ельскім, Чачэрскім раёнах на вёсцы працуюць не больш, як па два-пяць баяністаў. Хіба можна пры такіх умовах сур'ёзна гаварыць пра павышэнне мастацкага ўзроўню самадзейнасці.

Кадры, кадры і кадры... Цяпер не толькі кіраўнікі, але і тысячы наведвальнікаў клубаў востра ставяць гэтае пытанне. «У клубе павінен быць баяніст і іншыя спецыялісты-музыканты», — правільна зазначае Васіль Чэчыкаў з Літвінавічаў.

Да 662-х завочных інтэрв'ю з Чачэрскага раёна я дадам яшчэ адно — з начальнікам Гомельскага абласнога ўпраўлення культуры Э. Гладковічам.

Пытанне:

— Ці ёсць надзея, што ў бліжэйшыя гады ўсе сельскія клубы будуць мець баяністаў?

Адказ:

— Ёсць і даволі рэальная! Упраўленне распрацавала Палажэнне аб падрыхтоўцы баяністаў у музычных школах, зроблены эканамічны разлік. Пры кожнай школе (а іх у нас дзевятнаццаць) будуць працаваць дзесяцімесячныя курсы, займацца на якіх за кошт калгасаў змогуць у кожным раёне ў сярэднім па дваццаць чалавек. Мы свядома адмовіліся ад грамадскіх асноў у гэтай вельмі важнай справе, каб павысіць адказнасць педагогаў. Курсы пры Доме народнай творчасці таксама будуць працаваць. Мы падлічылі, што за чатыры гады здолеем такім чынам падрыхтаваць баяністаў не толькі для кожнага сельскага клуба, а і для кожнай брыгады калгаса і аддзялення саўгаса.

Зноў анкеты. Яны пераконваюць, якое шырокае кола інтарэсаў у працаўнікоў сельскай гаспадаркі.

«Хачу займацца ў фотагуртку», — пішуць шафёр П. Хімянкоў, работніца саўгаса Ганна Дуброўская (Нісімкавіцкі сельскі клуб) і многія іншыя.

Напэўна, у бліжэйшы час у іх з'явіцца магчымасць заняцца любімай справай. Э. Гладковіч гаворыць, што прынята рашэнне аб тым, каб забяспечыць сельскія клубы тэхнічнымі сродкамі. І яно паспяхова ажыццяўляецца — фотаапараты, магнітафоны, радыёпрыёмнікі, прайгравальнікі з'явіліся ўжо ў многіх сельскіх клубах. Будзе фотагурток і ў Нісімкавічах.

Амаль у кожнай анкеце — прапанова паслуг.

«Магу дзяжурыць і падтрымліваць парадак у зале ў час кінасеансаў і канцэртаў...»

«Хачу памагаць бібліятэкару ў выдачы кніг...»

«Магу чытаць лекцыі на сельскагаспадарчыя тэмы...»

«Умею афармляць наглядную агітацыю...»

«Хачу прыняць удзел у азеляненні прыклубнага ўчастка...»

«Я хацела б памагчы ў рамонце клуба».

А вельмі многія на пытанне: «Які ўдзел у рабоце клуба хацелі б прыняць вы?» — адказваюць: «Любы па маіх сілах».

Велізарная і кваліфікаваная армія зацікаўленых людзей прапануе свае паслугі. Больш як 450 чалавек з ліку апытаных праводзяць свой вольны час у клубе, і калі выкарыстаць уменне, здольнасці і жаданне кожнага, — установа культуры пераўтворыцца, стане добраўпарадкаванай, утульнай, прыгожай, г. зн. такой, якой хацелі б бачыць яе людзі. Усе, хто запоўніў анкеты, пішуць пра тое, што неабходна пабудаваць новы клуб або хутчэй скончыць будаўніцтва, якое зацягнулася, адрамантаваць, прыбудаваць пакоі для работы гурткоў або набыць добрую мэблю і ўстанавіць стацыянарную кінаапаратуру. (Між іншым, зусім незразумела, чаму ў анкетах няма нічога пра кінаабслугоўванне на вёсцы — такі вялікі і важны ўчастак клубнай работы; няўжо толькі з-за таго, што кіно — гэта другое ведамства?).

— Такое масавае апытанне, — гаворыць Э. Гладковіч, — паможа нам зрабіць работу культасветустаноў больш разнастайнай, бо цяпер мы дакладна ведаем, чым цікавяцца жыхары той ці іншай вёскі. Напрыклад, у анкетах, запоўненых у нейкім пэўным клубе, выказваецца жаданне займацца фатаграфіяй. Улічваючы гэта, мы, вядома, у першую чаргу дамо туды фотаапарат, значыць там будзе працаваць фотагурток, а гэта паможа прыгожа афарміць наглядную агітацыю, выпускаць насценныя газеты, фотавітрыны і выстаўкі, якія раскажуць пра жыццё калгаса ці саўгаса.

Але тут узнікае новая праблема — хто будзе кіраваць гурткамі?

— Мы вельмі спадзяёмся, — працягвае Э. Гладковіч, — на дапамогу сельскай інтэлігенцыі і ў першую чаргу на настаўнікаў.

У Гомельскай вобласці настаўнікі даўно сталі адданымі памочнікамі работнікаў культуры. І тым больш крыўдна было мне чытаць некаторыя анкеты з Чачэрскага раёна, запоўненыя настаўнікамі. Іншы раз ствараецца ўражанне, што піша старонні назіральнік, а не актыўны ўдзельнік жыцця сваёй вёскі. З самым сур'ёзным выглядам запоўніў анкету настаўнік Струменскай сярэдняй школы Ульян Фаміч Лугаўскі. У кожнага ёсць свой любімы занятак, і ў Лугаўскога таксама: рыбалоўства, прысядзібны сад, наведванне кінасеансаў і канцэртаў мастацкай самадзейнасці. І скардзіцца настаўнік, што ў клубе рэдка бываюць канцэрты, лекцыі. За год праглядзеў два сельскагаспадарчыя кінахасопісы — гэта, так сказаць, не па спецыяльнасці. Хацеў бы, как часцей і больш рэгулярна выступала мастацкая самадзейнасць, чыталіся цікавыя лекцыі, праводзіліся тэматычныя вечары. Падводзіць вынік: «Недастаткова працуе ў клубе грамадскасць».

А сам? «Будучы заняты прапагандысцкай работай і іншымі грамадскімі справамі, аказаць дапамогу клубу не змагу».

Такі адказ не можа не турбаваць. Іменна таму вынікі вывучэння кожнай анкеты трэба абмеркаваць не толькі сярод работнікаў культуры, але і на сходах інтэлігенцыі.

Як паказалі анкеты, 210 чалавек вольны час праводзяць дома. Гэта, вядома, там, дзе работа ў клубе пастаўлена нецікава, дзе безыніцыятыўныя культработнікі.

— Анкеты прымусілі нас сур'ёзна задумацца над формамі вучобы работнікаў, — гаворыць начальнік упраўлення культуры. — У Рэчыцкім раёне, напрыклад, створаны і паспяхова працуе універсітэт для работнікаў культуры — заняткі праводзяцца рэгулярна, развучваецца новы рэпертуар, вывучаецца перадавы вопыт. Трэба сказаць, што ў Чачэрскім раёне за апошні час пабудавана некалькі новых клубаў і дамоў культуры, больш разнастайнай і змястоўнай стала іх работа. Тут таксама ёсць магчымасць стварыць універсітэт...

Вывучэнне анкет паставіла перад работнікамі культуры шмат актуальных праблем.

— Мы, вядома, не абмяжуемся тым, што прааналізуем іх ва ўпраўленні культуры, — гаворыць Э. Гладковіч. — У бліжэйшы час правядзём нараду культасветработнікаў, на якой будуць падведзены вынікі апытання і намечаны практычныя меры па паляпшэнню работы сельскіх клубаў.

У анкетах людзі выказалі сваю думку, з якой нельга не лічыцца. Цяпер слова за работнікамі культуры.

Д. РАДЗІНСКІ,
кар. «Літаратуры і мастацтва».
г. Гомель.

Вось тут быў бой... Кому, кому, а Леаніду Канстанцінавічу Чарнічэнку ён запомніўся на ўсё жыццё. У той суровы час ён быў камісарам 178 дывізіі, якая абараняла Магілёў. Уважліва слухаюць настаўнікі школ г. Магілёва пра Буніцкі бой. Кранаюць душу, хваляюць словы экскурсавода, удзельніка гэтага боя Леаніда Канстанцінавіча Чарнічэнкі.

Фота М. ЖАЛУДОВІЧА, (БЕЛТА).

АКЦЁРЫ І РОЛІ

ДРАМА ЗАПОЗНЕНАГА СУМЛЕННЯ

А. Ільінскі ў ролі Капітона Ягоравіча.

Пра Аляксандра Канстанцінавіча Ільінскага можна пісаць бясконца...

Ён стварыў вельмі многа самых разнастайных сцэнічных вобразаў. Дастатковa сказаць, што сёлета артыст разам з калектывам будзе святкаваць сорак год сваёй працы на сцэне Коласаўскага тэатра. А ён жа яшчэ зачынаў і цяперашні Купалаўскі тэатр, беручы ўдзел, скажам, у адным з першых спектакляў — «На дне». Усё гэта заслугоўвае спецыяльнай гаворкі, вялікай аб'ёмнай кніжкі. А пакуль што—справы сённяшніх дзён.

На гастролях Беларускага тэатра імя Якуба Коласа, якія цяпер праходзяць у Мінску, Аляксандр Ільінскі ўзнімаецца на сцэну, бадай што, кожны вечар. Ён заняты амаль ва ўсіх спектаклях.

Не ведаю, наколькі разумна і па-гаспадарску выкарыстоўваюцца сілы акцёра Ільінскага. Згадзіцеся, у такім узросце іграць кожны вечар—нагрузка занадта вялікая. Іншыя кіраўнікі тэатраў ды і самі майстры не такія шчодрыя, яны з большай беражлівасцю эканомяць сілы. Не ведаю, мабыць, і сапраўды патрэбна вось такая беражлівасць. Ды напэўна ж патрэбна.

Толькі ад частых сустрэч Ільінскага з гледачамі гэтыя сустрэчы не становяцца звычайнымі, будзённымі, яны ўсё адно святочныя. І разумееш коласаўцаў—Аляксандр Ільінскі ўпрыгожвае спектакль. Выхад яго на сцэну нават проста ў чарговай ролі нярэдка можа стаць прынметнай тэатральнай падзеяй.

Так адбылося і ў спектаклі па п'есе Віктара Лаўрэнцьева «Шануй бацьку свайго...» Пры беднасці на добрыя сучасныя драматычныя творы, на яркія каларытныя вобразы, ролю накшталт Капітона Ягоравіча ў нас дзесяткі, калі не сотні. І ў далёка не лепшай п'есе Лаўрэнцьева роля Капітона Ягоравіча—адна з горшых.

Персанаж гэты амаль знячэўку з'яўляецца ў доме Кічыгіных, дзе разгортваюцца падзеі драмы. Яго тут пабойваюцца, хоць падстаў на вялікі непаной няма. І калі ёсць хоць якая-небудзь пэўная адзнака ў ролі, дык гэта яе службовасць. Здавалася б, у такой ролі можа «сыграць» хіба дзіванаваты выгляд старога ды незвычайнага памеру, а. магчыма, нават і колеру барада (у адным з тэатраў з Капітона рабілі... баптыста).

Адным словам, роля Капітона Ягоравіча— не для народных артыстаў. Іх-то ўжо ніхто не абавяжа, не прымусіць іграць такую ролю, для іх, які б ні быў бедны рэпертуар, заўсёды знойдуцца больш цінавыя вобразы. А вось народны артыст СССР А. К. Ільінскі выходзіць у ролі Капітона Ягоравіча. І расказвае акцёр у ёй—не ад аўтара, «ад сябе»—шмат і вельмі ўсхвалявана.

Асноўнай і, скажам заадно, ударнай сцэнай для Капітона з'яўляецца яго апошні выхад, калі герой расказвае пра мэту свайго нечаканага прыезду—яго падгаварыў Кічыгін-старэйшы, Гардзей Паўлавіч: маўляў, можна ўраваць для сябе добры нуш, ён жа ян-ніян Максімаў дзед. Ільінскі ў гэтай сцэне перадае душэўны боль чалавека, якога падманулі і якому цяпер перад усімі нясцерпна сорамна і вельмі няёмка.

— Каб можна было, скрозь зямлю праваліўся б,—звычайна гавораць людзі ў такім душэўным стане.

Зрэшты, акцёр няшмат дадае ў апошняй сцэне да характарыстыкі сцэнічнага вобраза. Выканаўца расказаў нам пра свайго героя так многа, што асабліва дадаваць пра Капітона Ягоравіча ў апошняй сцэне ўжо не было патрэбы.

Акцёр яркага, выключнага намедыйнага таленту, наогул, першы артыст тэатра, любімец публікі, ён шмат сваіх роляў праводзіў з бляскам, амаль канцэртна, іграючы ў спектаклі на першым плане. Гэта часам магло б перашкаджаць іншым выканаўцам, парушаць ансамблевасць—усё, аднак, акупілася сапраўднай арганічнасцю і вялікім імправізацыйным талентам артыста. Тым не менш пра яго майстэрства можна было расказваць шмат і з захапленнем.

Але той, хто больш пільна сачыў за Аляксандрам Ільінскім, не мог не заўважыць, што ў яго творчасці ў апошнія гады адбыліся вельмі прыкметныя змены. Ён нібы знарок адмовіўся ад знешняй яркасці, канцэртнага бляску, наб поўнасцю зліўшыся, так сказаць, з усёй масай у спектаклі, потым, у працэсе дзеяння, узрушаць гледачоў тонкім аналізам і вялікай псіхалагічнай глыбінёй. І ў такіх вось спектаклях неяк міжволі забываешся на выключнае майстэрства акцёра. Перад намі звычайны чалавек, якога, здаецца, мы ўжо дзесьці сустракалі.

Менавіта такі Ільінскі ў ролі Капітона Ягоравіча.

Гэты чалавек спачатку—самы звычайны стары, ён нічым не вылучаецца сярод іншых. Вельмі будзённая вопратка, зарослы і ўжо крыху азвылы твар, уся постаць ад доўгіх год жыцця нібы сама хіліцца да зямлі, цяжная хада, запаволеныя рухі... Але вось павітаўшыся з усімі ў доме, ён падыходзіць да Максіма, доўга трымае яму руку і пільна, вельмі дапытліва глядзіць яму ў твар, у вочы. І чым ён больш прыглядаецца да Максіма, да ўсёй сям'і Кічыгіных, тым лепш разумее, што яго ўнук выдатны чалавек і жыве ён таксама ў вельмі добрай, дружнай сям'і. А ён, Капітон Ягоравіч, трапіў у гэты дом выпадкова і фактычна тут лішні.

Адна са сцэн п'есы эфектна і інтрыгуюча заканчваецца словамі Капітона Ягоравіча, калі той, падвыпіўшы, загаднава і пагрозліва звяртаецца да маці сям'і і гаспадыні мічыгінскага дома Соф'і Іванаўны: маўляў, весяліся, сёння тваё свята, а заўтра будзе маё. Сэнс гэтых слоў такі: герой раскажа Максіму, што ён яго родны дзед, а маці не родная, зусім чужая жанчына і ўвесь час утойвала гэта і ад Максіма, і ад сваіх дзяцей.

Ільінскі гаворыць словы Капітона не загаднава і не пагрозліва. Яго герой добра ведае, што ад таго, раскажа ён Максіму ці не раскажа, справы не зменяцца. У Соф'і і сёння свята і заўтра будзе свята і паслязаўтра—разбіць моцную, дружную мічыгінскую сям'ю ні яму, ні камунебудзь іншаму не ўдасца.

Наступная сцэна Капітона з Соф'яй узрушае сваёй псіхалагічнай глыбіней і вялікім драматызмам. Капітон Ягоравіч нічога не патрабуе ад Соф'і. Яму нічога не трэба, а калі нават і трэба было б, ведае, што патрабаваць не мае права. Стары толькі просіць яго зразумець, зразумець ва ўсім, па-чалавечаму...

Капітона—Ільінскага нібы працінае пякучы, пакутлівы боль. Прыгожы, разумны, таленавіты Максім, яго роднай крыві Максім! І не яго. Ён не мае на роднасць права. Максіму неўзабаве ўжо трыццаць, а Капітон Ягоравіч да гэтага часу нават ні разу не пацікавіўся, што з ім, як яму жывецца. Адзінае, на што цяпер адважваецца герой,—папрасіць на памяць унукаву фотанартку.

Асноўнае гучанне ролі артыст скіроўвае ў маральна-этычны план. Яго Капітон самому сабе выносіць прысуд. Гэты прысуд жорстні і суровы—па законах жыцця нашага грамадства, па законах высокай чалавечнасці. Разбуджанае, усталыхнутае вялікімі хвалямі сумленне не дае супакою. Вось Капітон Ягоравіч нібы цень сунецца за Соф'яй. А перад ім дарогі няма, толькі сцяна. І ён, дайшоўшы да сцяны, падняў угору адчайна сціснутыя кулакі. Капітон перажывае вялікае гора, і ў гэтай сцэне вобраз, створаны акцёрам, узнімаецца да трагедыйнага гучання.

Мы нават па-чалавечаму спачуваем Капітону, раскаянне ж яго сапраўднае, чыстае. І разам з тым думаем пра іншае. Думаем пра тое, наб у людзей не было такога гора, каб у іх было чыстае, спакойнае сумленне. Каб людзі кавалі сабе толькі шчасце.

Мабыць, перш за ўсё пра гэта думае і Аляксандр Канстанцінавіч Ільінскі, не шкадуючы сваіх сіл, амаль кожны вечар узнімаючыся на сцэну.Ён выходзіць на падмосткі і дзеля таго, наб нават у невялікіх ролях, як Капітон Ягоравіч, паназваць цуды, тварыць, няхай не заўсёды маштабныя, няхай і маленькія сцэнічныя шэдэўры.

Анатоль САБАЛЕЎСКІ.

Колькі роляў — гэтулькі і аблічча́ў. Розных і непаўторных. А роляў за доўгае акцёрскае жыццё А. Ільінскага сыграна столькі, што і пералічыць немагчыма... Сярод іх — Несцерка з аднайменнай камедыі В. Вольскага, Швандзя з «Любові Яравой» К. Транёва, Аркашка з камедыі А. Астроўскага «Лес», колясаўскі дзед Талаш, дзяк Бацяноўскі са спектакля «Навальніца будзе» (па матывах трылогіі Я. Коласа «На роставях»)...

ДЗВЕСЦЕ ТЫСЯЧ «ДЗЯКУЙ»

Гэта зусім не перабольшана — цудоўныя словы «дзякуй» і «калі ласка» штодзённа сотні разоў чуе Аляксандр Фёдаравіч Чачын, загадчык культпалаткі Гомельскага Палаца культуры чыгуначнікаў імя Ул. І. Леніна. Больш за дзесяць год стаіць гэты будынак у любімым месцы адпачынку гамяльчан—на Пралетарскім лузе.

Гамакі, більярд, настольны тэніс, шахматы, шашкі, мячы бяруць тут людзі напракат. Плата? Ніякай. Дастаткова назваць сваё прозвішча, і вы атрымаеце патрэбную рэч.

Аляксандр Фёдаравіч называе дакладную лічбу—за ўсе гады існавання культпалаткі знік толькі адзін гамак. І тут жа дадае:

— Напэўна, проста забыліся прынесці...

Як добра, калі людзям верацьі На Пралетарскім лузе ў людзей заўсёды цудоўны настрой—лес, рака, сонца. І чалавечая чуласць—гэта таксама вельмі важна.

Д. ІСАЧАНКА.

НАРОЎНІ З ПРАФЕСІЯНАЛАМІ

У Саюзе мастакоў БССР адбылося пасяджэнне мастацкага савета па дэкаратыўна-прыкладному мастацтву. Яно было не зусім звычайнае — нароўні з работамі прафесіяналаў разглядаліся і творы народных умельцаў Мінскай і Віцебскай абласцей.

Майстры з горада Барысава парадавалі арыгінальнымі вырашэннямі ў вязанні кофтачак, шарсцяных шарфаў, сурвэтак. Іх вырабы свежыя па фасону. Перапляценні бавоўняных тканін і лёну ствараюць своеасаблівы малюнак.

Народныя ўмельцы Віцебшчыны распрацавалі новы ўзор шарсцянога дывана-капы. Мажорная каларыстычная гама выгадна вылучае яе з іншых вырабаў. Гэтымі ж майстрамі была паказана і другая цікавая капа, выключная па дэкаратыўнаму эфекту—у ёй спалучаюцца бавоўняныя тканіны і мулінэ. Чырвона-чорны арнамент надзвычай прыгожы.

Па-новаму распрацоўваюць народныя майстры і ручнік. Тканы нацыянальны арнамент серабрыстага адцення па матава-белым полі гарманіруе з мяккімі чырвонымі палосамі дэкору ў ніжняй частцы ручніка.

Усе памянёныя вырабы віцебскіх умельцаў экспанаваліся ў Маскве на выстаўцы сувеніраў, наладжанай Беларускім пастаянным прадстаўніцтвам. Там яны атрымалі высокую ацэнку.

Рэзчыкі па дрэву Мінскай вобласці паказалі новыя точаныя цацкі, шкатулкі з кораня бярозы і беларускай чачоткі.

На наступным пасяджэнні мастацкага савета будуць разгледжаны вырабы народных умельцаў Брэстчыны.

З'яўленне на пасяджэнні савета работ майстроў народнага мастацтва — не выпадковасць. Гэта вынік работы секцыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Саюза мастакоў БССР. Кіраўнік секцыі мастак В. Гаўрылаў і галоўны мастак майстэрань Мастацкага фонду БССР І. Белановіч правялі семінар з народнымі ўмельцамі Віцебскай вобласці, памаглі ім выбраць лепшыя работы для выстаўкі. Такую ж работу правёў В. Гаўрылаў з народнымі ўмельцамі Брэстчыны.

На пасяджэнні савета разгледжаны цікавыя работы керамістаў. Л. Панамарэнка паказаў сувенірную фігурку «Лянок» (тэракота, бясколерная глазура). Ф. Зільберт, які працуе над сувенірнай серыяй на спартыўную тэму, паказаў забаўныя фігуркі «Баксёры», «Штангіст», «Футбаліст». Серыя прысвячаецца Усесаюзнай спартакіядзе студэнтаў, якая сёлета будзе праводзіцца ў Мінску.

Высокімі дэкаратыўнымі вартасцямі, навізнай формы, багаццем каляровых спалучэнняў — яркааранжавага, шэра-блакітнага — вылучаецца дэкаратыўная ваза «Пеўнік» Т. Паражняка.

Серыю падвесных насценных кашпо распрацавала М. Цвяткова. Іх можна ўжываць у любым інтэр'еры.

Прываблiваюць і новыя работы Н. Якавенка, якая паспяхова авалодвае керамічным матэрыялам. Яе работы «Задумалася» і іншыя вызначаюцца пластычнасцю, рытмічнасцю руху, добра выяўляюць матэрыял.

Будзем спадзявацца, што ўсё гэта мы неўзабаве ўбачым на паліцах магазінаў.

Б. ФРАНЦАЎ.

ВОДГУКІ, АДКАЗЫ

«РАСЧАРАВАННЕ СВЯТЛАНЫ ЛАСУЦКАЙ»

Так называўся артыкул, змешчаны ў «Літаратуры і мастацтве» 3 чэрвеня 1966 года.

Артыкул узнімаў праблемы маральнага выхавання работнікаў гандлю, асабліва моладзі. Як паведамілі ў рэдакцыю дырэктар Мінпрамгандлю І. Катэнка і сакратар партыйнай арганізацыі ўстановы І. Баканенка, артыкул абмяркоўваўся на адкрытым партыйным сходзе. Усе факты прызнаны правільнымі.

Партыйны сход абавязаў партбюро, аб'яднаны камітэт прафсаюза, камітэт ЛКСМБ і ўсіх камуністаў установы больш строга падыходзіць да падбору кадраў, палепшыць палітыка-выхаваўчую работу ў магазінах, уважліва ставіцца да маладых прадаўцоў.

КАЛІ ЎЛАДА ПРОЦІПАКАЗАНА...

У ПІСЬМЕ, дасланым у рэдакцыю, сцвярджалася, што дырэктар Брэсцкага абласнога Дома народнай творчасці Георгій Уладзіміравіч Гаеўскі—невук, выпадковы чалавек у органах культуры, разваліў работу ўстановы, якую ўзначальвае, і гэтак далей у тым жа духу.

Пісьмо ўражвала сваёй катэгарычнасцю і багаццем фактаў. Сумнявацца ў іх сапраўднасці, як быццам, не было ніякіх падстаў, бо і раней у рэдакцыю прыходзілі сігналы, што ў Брэсцкім Доме творчасці не ўсё ладзіцца.

Вось чаму яшчэ да прыезду ў Брэст мне ўсё здавалася ясным. І, як гэта часта бывае, ужо наперад я збіраўся пісаць пра чалавека, якога «кінулі» на кіраўніцтва мастацтвам з якога-небудзь райспажыўсаюза, хоць у мастацтве ён, як кажуць, ні гу-гу. О, гэта можна здорава абыграць, радаваўся я. Нават на фельетон цягне.

Можна ўявіць маё здзіўленне, калі ў Брэсце адзін з паважаных дзеячоў культуры — Мікалай Іосіфавіч Шошчыц, стваральнік і кіраўнік народнай харавой капэлы, якая славіцца на ўсю рэспубліку, — сказаў пра Гаеўскага так: «Георгій Уладзіміравіч — адзін з самых моцных музыкантаў вобласці. Сам і аранжыруе музыку, сам распісвае партытуру».

Прыблізна так ахарактарызаваў Гаеўскага і Міхаіл Іванавіч Пузанаў, кіраўнік народнага ансамбля танца.

«Добры спецыяліст», — сказалі пра Гаеўскага начальнік Абласнога ўпраўлення культуры Мікалай Панцеляймонавіч Шаўчук і яго намеснік Міхаіл Васільевіч Лукашук.

І разам з тым кожны з іх тут жа прызнаваў, што Гаеўскі на пасадзе дырэктара Дома народнай творчасці... ну, не таго...

Пазней, калі прыйшлося пабываць у гэтай установе, дэталёва пазнаёміцца з яе работай, я ўпэўніўся, што «не таго» — вельмі слаба сказана. Гаеўскага трэба вызваляць ад пасады. І чым хутчэй, тым будзе лепш для мастацкай самадзейнасці.

Што такое сёння Брэсцкі абласны Дом народнай творчасці? Гэта ўстанова, якая фактычна страціла сувязі з творчымі калектывамі.

Праўда, фармальна ў доме нешта, як быццам, і робіцца.

У адным з пакояў на сцяне вісіць вялікі аркуш паперы, на якім друкарскім спосабам надрукаваны план работы на другі квартал гэтага года. План добры. Але тры чвэрці намечаных мерапрыемстваў так і засталіся на паперы. Вось толькі адна секцыя — харэаграфічнага мастацтва. У маі намячаўся пяцідзённы абласны семінар кіраўнікоў танцавальных калектываў. Не адбыўся, бо ніхто не прыехаў. 11 красавіка, 12 мая і 6 чэрвеня павінны былі адбыцца пасяджэнні секцыі, прысвечаныя абмеркаванню рэпертуару, тэорыі і практыкі работы з танцавальнымі калектывамі. Сарваліся, бо прыйшло толькі некалькі чалавек з горада. Кожны чацвер лавінны праходзіць заняткі студыі сучаснага бальнага танца. Яшчэ не было ніводнага, бо «няма жадаючых».

Такое ж становішча і ў іншых творчых секцыях. Тры гады ніяк не збярэцца семінар самадзейных майстроў выяўленчага і прыкладнога мастацтва. Ніводнага разу не праводзіліся намечаныя планам заняткі з кіраўнікамі духавых аркестраў. З красавіка ўсё адкладаецца семінар самадзейных кампазітараў вобласці, семінар-практыкум культасветработнікаў і г. д., і г. д. — усяго не пералічыш.

Але і тыя семінары, курсы, нарады, якія склікаюцца, носяць чыста фармальны характар. Іх каэфіцыент карыснага дзеяння часта роўны нулю. Мне расказвалі, што бывалі выпадкі, калі семінар праводзіўся з... адным чалавекам.

Чаму ж не цягне самадзейных артыстаў у Дом творчасці? Таму, што навучыцца тут няма чаму. Дом творчасці — гэта, перш за ўсё, цэнтр метадычнай работы. А тут? Некалі пры доме функцыяніраваў метадычны кабінет. Гаеўскі яго скасаваў. Была бібліятэка — яе напаткаў такі ж самы лёс. Вось ужо два гады Дом творчасці не выпісвае ніякай спецыяльнай літаратуры...

А цяпер мне хочацца пагаварыць пра асобу самога Георгія Уладзіміравіча. Прызнацца, усё, што я чуў пра яго, што ўбачыў на свае вочы, выклікае на вялікі роздум. Не, аўтар пісьма не меў рацыі, калі пісаў, што Гаеўскі невук і ў культуры выпадковы чалавек. Калі б гэта было так, дык усё б можна было лёгка вытлумачыць. Кіраваў, маўляў, чалавек шавецкай майстэрняй, а цяпер даручылі яму, як аматару, кіраваць мастацкай самадзейнасцю. І не выцягнуў. Што з яго возьмеш. Але ж Георгій Уладзіміравіч — музыкант-прафесіянал (няма ніякіх падстаў браць пад сумненне характарыстыкі, якія прыводзіліся вышэй) і працуе ў мастацкай самадзейнасці больш трыццаці гадоў.

Так што фармальныя падставы даць яму гэтую адказную пасаду былі. Але фармальныя падставы, калі кіравацца толькі імі, часта,—ой, як падводзяць.

Нагадаю эпізод, які расказаў чалавек, што даўно ведае Гаеўскага і некалі разам з ім працаваў у Брэсцкім клубе чыгуначнікаў.

— Георгій Уладзіміравіч кіраваў там духавым аркестрам. Аднойчы здарылася няшчасце: адзін з музыкантаў—ён працаваў, здаецца, счэпшчыкам вагонаў,—папаў пад поезд. Усе былі страшэнна ўзрушаны. І вось, калі трэба было хаваць таварыша, Гаеўскі раптам забараніў аркестру ісці на могілкі, маўляў, сарвецца рэпетыцыя. Гэтая незвычайная душэўная чэрствасць так абурыла рабочых, што яму давялося кінуць работу ў клубе.

А вось яшчэ. Некалькі гадоў назад у Доме творчасці працавала Галіна Каністратава. Выхаванка дзіцячага дома, яна ў свой час закончыла музычнае вучылішча і лічылася нядрэнным метадыстам па хору. Яшчэ і сёння пра яе ўспамінаюць, як аб адданым справе, добрым і далікатным чалавеку. Неўзабаве дзяўчына выйшла замуж. Нарадзілася дзіця. Глядзець яго не было каму, і Галіна папрасіла даць ёй водпуск за свой кошт. «Водпуск я вам не дам,— сказаў Гаеўскі,—калі хочаце, дык падавайце заяву аб звальненні». І тут жа паабяцаў пры ўсіх, што потым у любы момант возьме яе назад. «Заява такая мне патрэбна, каб на гэты час узяць чалавека»,—растлумачыў дырэктар. Маладая жанчына згадзілася і падала заяву.

Неўзабаве ў Галіны пачаліся нелады ў сямейным жыцці. Сваякі мужа, у якіх яна жыла, літаральна выганялі яе з дзіцем на вуліцу. Жанчына аказалася без сродкаў для існавання. Тады яна ўспомніла пра абяцанне Гаеўскага і прыйшла ў Дом творчасці. Але дзе там. Дырэктар і слухаць яе не хацеў, хоць месца Галіны яшчэ не было занята. Тлумачылася гэта [illegible] та—жанчына з дзіцем зможа [illegible] часта выязджаць [illegible] раён. Адным словам, Галіна ў роспачы зачыніла за сабой дзверы. А праз некалькі дзён яе не стала.

Пра гэты выпадак тады многа гаварылі ў Брэсце. Зноў абураліся чэрствасцю Гаеўскага...

Дзіўна атрымліваецца. Калі хоча чалавек вучыцца музыцы, у яго абавязкова правяраюць музычны слых. Нікому не прыйдзе ў галаву пасадзіць за фартэпіяна чалавека, якому мядзведзь наступіў на вуха.

Чаму ж на крэсла кіраўніка ў нас, бывае, садзяць чалавека, які, можа, здольны на ўсё іншае, толькі не на тое, каб кіраваць людзьмі. Бо гэтая вельмі тонкая справа таксама, як і музыка, патрабуе ўнутранага слыху. Своеасаблівага слыху—умення разумець і паважаць людзей, быць чулымі да іх. Гэтая якасць абавязковая для кіраўніка, пад началам якога знаходзіцца хоць дзесяць тысяч, хоць дзесяць чалавек.

Аб душэўных якасцях Гаеўскага ведалі ўсе—ён мясцовы старажыл. І тым не менш, палічылі магчымым паставіць яго на чале вялікай арміі самадзейных артыстаў.

Цяпер начальнік Абласнога ўпраўлення культуры няўцямна паціскае плячыма:

— Дзіўны гэты Гаеўскі, справу ж ведае, а людзі да яго не ідуць. Нейкі ён халодны, не вабіць да сябе...

А ўсё вельмі проста. Кароннае месца Георгія Уладзіміравіча — дзе-небудзь у аркестры. Вось там бы ён прыносіў карысць. Як радавы музыкант, які мае справу толькі са сваім інструментам.

А тут... Тут у Доме творчасці адмоўныя якасці Георгія Уладзіміравіча расцвілі, як на добра ўгноенай глебе. Бо ёсць дзе гэтым якасцям разгуляцца, ёсць дзе знайсці ім прымяненне. І ўсё гэта прымае проста дзікія формы. Гаеўскаму не прыйшоўся па душы кіраўнік студыі выяўленчага мастацтва П. Данелія. І студыя, якая праіснавала 15 гадоў, клопатамі дырэктара закрываецца. Патрабавалася ўмяшальніцтва абкома партыі, каб зноў яе адкрыць. Георгій Уладзіміравіч не ў ладах з метадыстам па выяўленчаму мастацтву М. Сарварам. Гнеў свой дырэктар пераносіць на само мастацтва. Унікальныя работы самадзейных майстроў—інкрустацыі і разьба па дрэву, мастацкія вышыўкі, скульптурныя партрэты—па загаду дырэктара скідваюць у кладоўцы.

У Брэсце я пазнаёміўся з Зінаідай Васільеўнай Шкуновай. Гэтая пажылая ўжо жанчына, пенсіянерка—майстар мастацкага вышывання. Яе работы ў свой час экспанаваліся на многіх выстаўках, у тым ліку ў Маскве.

— Некалі Дом творчасці быў наш дом,—расказвае Зінаіда Васільеўна.—Ведалі, што заўсёды знойдзем мы там і падтрымку, і добрую параду. А цяпер і зайсці туды няма ахвоты. Гаеўскі нават не вітаецца. Не любіць ён людзей. Яшчэ ў лютым на абласным аглядзе самадзейнага мастацтва мне і яшчэ некалькім вышывальшчыцам былі прысуджаны граматы і дыпломы. А ўручылі—не, нават не ўручылі, а проста аддалі іх у калідоры—нядаўна, у чэрвені. Сцёртыя паперкі, якія да гэтага недзе пыліліся на шафе. Хіба гэта не крыўдна? Справа не ва ўзнагародзе, а ў элементарнай пашане да нашай працы. Мае сяброўкі так і сказалі—кінем гэтае вышыванне, калі да нас такія адносіны.

Не падзяліў нешта Гаеўскі з дырэктарам Брэсцкага музычнага вучылішча Міхаілам Рыгоравічам Солапавым—у выніку Георгій Уладзіміравіч адмаўляецца праводзіць работу з самадзейнымі кампазітарамі вобласці.

Такіх прыкладаў можна прывесці мноства.

У апошні дзень майго знаходжання ў Брэсце мы доўга гутарылі з Георгіем Уладзіміравічам. У разгар размовы ён раптам падняўся з-за стала, падбег да дзвярэй кабінета і доўга стаяў там да нечага прыслухоўваючыся. Потым прыадчыніў дзверы і зазірнуў у калідор. Нічога не разумеючы, я са здзіўленнем глядзеў на гэтыя манеўры дырэктара. А ён, вярнуўшыся на дыбках да стала, растлумачыў:

— Нашы супрацоўнікі вельмі цікаўныя, любяць падслухоўваць пад дзвярыма...

Не, Георгій Уладзіміравіч не бачыць ва ўсім, што адбываецца ў Доме творчасці, нічога дрэннага. Праўда, ён крыху напалоханы. Яго работу правяраюць абком партыі, фінансавыя органы, а тут яшчэ і карэспандэнта прынесла. Усе гэтыя непрыемнасці Гаеўскі адносіць за кошт сваіх яўных ворагаў, якія быццам бы акапаліся тут, у яго пад бокам. Вось ужо каторы месяц дырэктар, закінуўшы справы, вядзе вайну з метадыстам па драматычнаму мастацтву Т. Пятніцкай, якая асмелілася напісаць пісьмо пра дрэнную работу дома ў абком партыі. У адказ Георгій Уладзіміравіч заняўся зборам звестак, якія, на яго думку, павінны скампраметаваць жанчыну. Ён піша ў Тэатральна-мастацкі інстытут, дзе завочна займаецца Пятніцкая, што яна паступіла сюды па ліпавых дакументах. Правяраюць. Дакументы сапраўдныя. Гаеўскі не супакойваецца. Піша ў ваенкамат, які выдаў Пятніцкай юбілейны медаль, прысвечаны дваццацігоддзю перамогі над фашысцкай Германіяй, што яна ніколі не служыла ў арміі. І гэта аказалася паклёпам. Але досыць...

Я пытаюся ў Георгія Уладзіміравіча, ці не сорамна яму так рабіць?

— А чаму яна на мяне?

Вось яна логіка абываценя. Я заўважаю, што гэта непрыгожа, нарэшце, не па-мужчынску. У адказ Георгій Уладзіміравіч глядзіць на мяне чыстымі і нявіннымі вачыма.

...Вось такія справы адбываюцца пад дахам Брэсцкага Дома народнай творчасці. Ці не час Абласному ўпраўленню культуры раскрыць у доме насцяж усе вокны і дзверы, каб даць туды доступ свежаму паветру, каб кожнаму, хто зойдзе туды, дыхалася лёгка і свабодна.

М. ЗАМСКІ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

ГРАМАДСКІ АГЛЯД БІБЛІЯТЭК

НАШЫ ЛЕТАПІСЦЫ

Пад рубрыкаю «Пад сцягам Кастрычніка» змешчаны матэрыялы пра ўсе знамянальныя падзеі, якія адбываліся ў раёне за гады Савецкай улады. У раздзеле «Ніхто не забыты і ніштo не забыта» запісаны прозвішчы 52 аднавяскоўцаў, якія аддалі жыццё за Радзіму ў змаганні з фашызмам.

Самы вялікі раздзел — «Аб людзях харошых»—прысвечаны працоўным справам рабочых нашага саўгаса «Трасціно». Матэрыялы раздзела «Любі свой край, беражы прыроду» расказваюць аб прыгажосці і багацці нашых нетраў і лясоў, рэк і азёр. Тут можна знайсці матэрыялы і пра садоўнікаў-аматараў з нашых вёсак, пра тую работу, што праводзіцца ў месячнікі саду.

Апошняя частка альбома—«Літаратурная старонка» — адкрываецца партрэтам Аркадзя Куляшова і яго вершамі пра родны край. Яна расказвае аб кнігах пісьменнікаў-земляко́ў Пятра Прыходзькі, Паўла Кавалёва, Івана Новікава, Івана Бурсава, Пятра Васілеўскага...

Збіраем мы і рэцэнзіі на кнігі мясцовых аўтараў, вершы пачынаючых паэтаў-аднавяскоўцаў.

Па сабраных матэрыялах альбома праводзяцца тэматычныя вечары і гутаркі пра мінулае і пра сённяшні дзень роднага краю.

Цікава прайшоў літаратурна-мастацкі вечар «Я ведаю — няма зямлі на свеце такой цудоўнай, як мой родны край!». Надоўга застанецца ў памяці вечар «Нашы землякі—змагары за шчасце народнае». Актывісты бібліятэкі выступілі з расказамі пра нашых землякоў — байцоў ленінскай гвардыі. Быў зроблен і бібліяграфічны агляд «Што чытаць пра нашых землякоў-рэвалюцыянераў».

Цікава прайшлі вечары «Успомнім тых, хто легендай авеяны», «Клімавіцкі раён ад выбараў да выбараў», «Ой, шумі, зялёны магілёўскі бор!» (пра абарону зялёнага сябра—лесу), канферэнцыі чытачоў па кнізе К. Арлоўскага «Такім можа стаць кожны калгас», калектыўнае абмеркаванне кнігі Я. Акушэвіча «Агні ў родных лясах».

Адзін з вечароў бібліятэка прысвяціла абмеркаванню твораў, адзначаных Коласаўскімі прэміямі за 1965 год. Гутарка ішла пра кнігу М. Лужаніна «Колас расказвае пра сябе» і дакументальную аповесць нашага земляка І. Новікава «Дарогі скрыжаваліся ў Мінску».

У адрас пісьменнікаў былі напісаны пісьмы, у якіх чытачы дзякавалі ім за цікавыя кнігі.

Мы трымаем цесную сувязь з пісьменнікамі-землякамі. Яны нам прысылаюць кнігі з аўтографамі, расказваюць пра свае творчыя планы.

Хочацца, каб на паліцах нашых бібліятэк было многа добрых кніг пра выдатных людзей беларускай зямлі, аб гісторыі родных гарадоў і вёсак.

М. ЛАСОЎСКІ,
загадчык Трасцінскай сельскай бібліятэкі Клімавіцкага раёна.

Каштоўным матэрыялам для выхаваўчай работы з моладдзю з'яўляюцца кнігі пра жыццё і дзейнасць выдатных ураджэнцаў роднага краю. У снежні 1963 года ў выдавецтве «Беларусь» выйшла кніга Р. Булацкага «Ленінскай гвардыі салдат» — пра палымянага публіцыста і рэвалюцыянера, саратніка Ул. І. Леніна—П. Лепяшынскага, ураджэнца нашага краю. Кнігу, якая выдадзена ў Беларусі, бібкалектар прыслаў нам у адзіным экземпляры. І гэта на 500 чытачоў! Рознымі шляхамі давялося дадаткова шукаць кнігу не толькі Р. Булацкага, а таксама В. Барадзіной «Магілёўская вобласць», зборнік «Героі Савецкага Саюза — магіляўчане». Наогул, усе нашы спробы добра ўкамплектаваць бібліятэку краязнаўчай літаратурай праз «Магілёўскі бібліятэчны калектар пакуль што не даюць станоўчага выніку.

Адсутнасць многіх неабходных кніг краязнаўчага характару яшчэ ў 1954 годзе навяла актывістаў нашай бібліятэкі на думку—лепш выкарыстоўваць матэрыялы, апублікаваныя ў перыядычным друку. Спачатку мы адсылалі чытачоў да падшывак газет, пасля пачалі рыхтаваць газетныя выразкі на краязнаўчыя тэмы і складваць іх у папкі. Пазней узнікла думка стварыць спецыяльны альбом. Яго хацелася бачыць як кнігу-летапіс, які стаў бы своеасаблівай гісторыяй роднай вёскі. Хацелася таксама, каб кніга-альбом была ў добрай вокладцы, прыгожа афармлена.

Так пачаў згуртоўвацца наш актыў краязнаўцаў-прапагандыстаў, у склад якога ўвайшлі многія выкладчыкі Трасцінскай сярэдняй школы, члены савета бібліятэкі, чытачы. Збіранне і адбор матэрыялаў аб родным краі значна ажывіліся.

Усе сабраныя матэрыялы мы наклейваем на лісты кнігі-летапісу. Гэтаму альбому далі назву «Наш родны край». Адкрываўся ён эпіграфам з верша К. Кірэенкі «Магілёўшчына»:

Зямля мая цудоўнай Магілёўшчыны,
Ты ўся з красы і радасці саткана.

Матэрыялы ў альбоме размясцілі ў храналагічнай паслядоўнасці па раздзелах: «З мінулага», «Нашы землякі—змагары за шчасце народнае», «Пад сцягам Кастрычніка», «Старонкі незабыўных дзён», «Аб людзях харошых», «Гары, камсамольскі агеньчык», «Дружба з чэхаславацкімі сябрамі», «Упрыгожым вёскі садамі», «Любі свой край, беражы прыроду» і «Літаратурная старонка».

Хочацца расказаць больш падрабязна пра некаторыя лісты альбома. У раздзеле «З мінулага» сабраны матэрыялы з гісторыі нашага краю. Пра выдатных рэвалюцыянераў П. Лепяшынскага, Ул. Бонч-Бруевіча, Я. Зевіна, М. Кураку і іншых ідзе гаворка ў раздзеле «Нашы землякі—змагары за шчасце народнае».

ПАЛОТНЫ, ПОЎНЫЯ СОНЦА

Дваццаць дзён у выставачным памяшканні Дома архітэктара па вуліцы Карла Маркса экспанаваліся работы маладога мастака і архітэктара Нінель Іванаўны Шчаснай.

У невялікай зале — каля сарака жывапісных палотнаў, графічных лістоў, фатаграфій інтэр'ераў. Ля іх ішла маўклівая гаворка гледача з мастаком, чыя творчасць знаходзіцца яшчэ ля вытокаў, з мастаком, у творах якога зліліся паэтычная душа, узлёт фантазіі і рэальнае светаадчуванне.

Многія свае палотны Шчасная напісала ў Таджыкістане. На выстаўцы мы бачым пейзажы Бухары, Душанбе, ускраін гарадоў з іх звілістымі вузкімі вулічнамі, партрэты людзей працы. І ўсюды яркая сонечная Сярэдняя Азія. Побач з імі апошнія творы мастака, зробленыя ў Беларусі—партрэты, карціны «Вясёлка», «Лазня». Тут іншы каларыт, іншая манера пісьма.

Н. Шчасная, адчуваецца, шукае свае шляхі ў мастацтве. У партрэтных работах яна імкнецца адысці ад просталінейнай расшыфроўкі вобраза. Жадаючы паказаць унутраны свет чалавека, карыстаецца метафарамі, гіпербалямі. У выніку з'яўляюцца партрэты «Вочы, каштоўныя каменьчыкі; адно — рубін, другое — ізумруд», «Снег ідзе», «Чалавек з папярэсаю».

Раман І. Мележа «Людзі на балоце» даўно заваяваў сэрцы шматлікіх чытачоў і пераступіў межы рэспублікі. Нядаўна выйшаў з друку пераклад яго на румынскую, фінскую і мадзярскую мовы. Вокладкі гэтых кніг вы бачыце на здымку.

Сярод кніг

СТАНАЎЛЕННЕ ПАЭТА

Другі зборнік Рамана Тармолы «Поўня» яшчэ раз засведчыў, што аўтар яго — здольны паэт.

Вось, напрыклад, верш «Хлеб», якім адкрываецца кніжка. Апроч таго, што ў ім з павагаю і святасцю гаворыцца пра самую неабходную з усіх зямных даброт, верш і пабудаваны цікава. Кожная яго страфа ўяўляе сабою паралель, супастаўленне тэмы хлеба і тэмы працы, у тым ліку і літаратурнай. А першая страфа аб'ядноўвае гэтыя дзве тэмы.

Не ўпершыню я думаю: калі,
Хто расказаў аб ім з усіх найлепш...

Пытанне не простае. Разумець яго трэба, вядома, не ў літаральным сэнсе. Уся справа ў другой палавіне страфы:

Пра хлеб мы столькі вершаў напяклі
І ўсё ж
не замянілі вершы хлеб.

Вось, значыцца, пра якія вершы ідзе гаворка! Не толькі і не столькі пра тыя, якія прысвечаны хлебу, а пра тыя, якія патрэбны людзям, як хлеб. І вельмі дарэчы тут гэтае адценне жалю з прычыны таго, што ўсё-такі мала яшчэ вершаў, без якіх людзі не маглі б абысціся, як не могуць яны абысціся без хлеба. І ёсць ва ўсім гэтым тая вельмі патрэбная вершам сур'ёзнасць, якая ў сённяшняй паэзіі, на жаль, часам падмяняецца глыбакадумным філасофстваннем на мелкіх месцах.

Цікава задуманы і змястоўны верш «Клёну» — пра старую маці, пра прадчуванне немінучага. З чуллівай сыноўняй далікатнасцю паэт пра ўсё гэта гаворыць не маці, а клёну, яе аднагодку, што расце пад акном яе дома. Паэт просіць яго пражыць як мага болей, бо

Не ўсё яшчэ матулі сказана.
Яшчэ меней для матулі зроблена,
Толькі-толькі рукі я закасваю,
І мая жар-птушка шчэ не злоўлена...

Паэзія ў тым, што паэт, размаўляючы, напрыклад, з птушкаю або дрэвам, праз іх размаўляе са светам; у тым, што выпадковая галінка або каменьчык могуць навесці яго, паэта, на вялікую думку.

Вельмі характэрны для Р. Тармолы верш «Асенні гром». Увогуле, калі ўспомніць і першую яго кніжку, дык можна заўважыць, што з усіх з'яў прыроды паэта больш за ўсё прываблівае навальніца. Але навальніца гэтая незвычайная: яна бушуе ў хвіліны найбольшых душэўных узрушэнняў, людзі нібы самі ўдзельнічаюць у яе «стварэнні», як гэта было ў вершы «Верасовы дождж» з кнігі «Асколкі і росы». У вершы «Асенні гром» Р. Тармола карыстаецца, па сутнасці, гэтым жа прыёмам, хоць ён і ўжыты для характарыстыкі іншага душэўнага стану — гора ад таго, што памёр самы родны чалавек: маці. Гром нараджаецца тут, на зямлі, і гэты зямны гром заглушае нябесны:

Ён аж пад хмарамі рэхам грукаў,
Падаў, нібыта з высокіх стром,
Крокі людзей і дажджу
па бруку
Глушыць аркестра журботны гром...

Як бачым, Р. Тармола надзелены паэтычным мысленнем, ён здольны выказаць паэтычную думку па-свойму, свежа і арыгінальна. І не толькі выказаць, але і ўмела аформіць яе славесна, як вось тут:

Яшчэ з паўдня даўжэе дрэваў цень.
І кожны ліст
як пёрка ў жоўтым крыллі,
І журавель калодзежны ляцець
Збіраецца за жураўліным клінам.

Але хочацца сказаць і аб тым, што насцярожвае і не задавальняе ў зборніку Р. Тармолы, аб тым, што мяне насцярожвала і не задавальняла, дарэчы, і ў ягонай першай кніжцы. Галоўнае — нейкая няпэўнасць у думках, якія складаюць сутнасць вершаў.

Уражанне часам такое, быццам аўтар, пачынаючы працаваць над вершам, не зусім ясна ўяўляе сабе яго думку. Гэта можна прасачыць на прыкладзе верша «Бяссоннае сонца»:

Я зайздрошчу табе,
бяссоннае сонца:
Колькі светаў ты бачыш,
колькі людзей.
Калі б нават жыццё ўсё—
адна бяссонніца,
За жыццё я не ўбачу, што бачыш
за дзень.

У гэтым зачыне ясна і пэўна выказана пачуццё добрай зайздрасці да сонца, якое мае магчымасць агледзець усю нашу планету з яе людзьмі і мацерыкамі. Зусім натуральным было б такое развіццё выказанай думкі, але далей ідуць радкі:

Я зайздрошчу табе,
бяссоннае сонца.
Я прашу: не прыходзь да мяне,
бяссонніца.
Пасля ночы
хай прыйдзе звычайны дзень,
Я патрэбен яму,
як сціплы прамень,
Я патрэбен яму,
як другія патрэбны,—
Каб планета наша
ззяла здаля.
Справа рук — для яе лепшы гімн
хвалебны,
Бо другое бяссоннае сонца —
Зямля!

Значыць, так: паэт адмаўляе бяссонніцу таму, што хоча сустрэць дзень, адпачыўшы і выспаўшыся. У сваю чаргу, гэта патрэбна для таго, каб паслужыць зямлі ў якасці «сціплага промня»: зямля ж павінна «ззяць здаля». Падразумяваецца, што промнем чалавека робіць праца, а чалавек робіць зямлю «другім сонцам». Навошта ж тады зайздросціць сонцу? Паэт жа і так жыве на другім сонцы — на зямлі...

Р. Тармола любіць прыроду. Прыкметнае яго імкненне паказаць дабратворны ўплыў прыроды на чалавека («У лесе вельмі многа цішыні...», «Грыбнікі» і інш.), а з другога боку — «ачалавечыць» прыроду, прымусіць яе хадзіць, бегаць, хітрыць, кахаць і г. д. І гэта не выклікае пярэчанняў. Бяда ў тым, што прырода паўстае ў паэта ў занадта агульных малюнках, яна расплываецца ў няпэўную пляму: лес — гэта лес наогул; дождж, рака, снег, воблака — гэта толькі прывычныя словы, абазначэнне таго, што бачыць чалавек, які не ўтлядаецца пільна ў навакольны свет.

Гэты недахоп тлумачыцца, магчыма, тым, што Р. Тармола больш чуе, чым бачыць. У яго зусім нямнога зрокавых вобразаў — тэлевізійная вышка, падобная на наваготнюю ёлку, машыны з сенам, падобныя на мядзведзяў, ледзяшы, падобныя на васковыя свечкі. У астатнім яго вобразы, калі можна так сказаць, гукавыя. Але тут зноў супярэчнасць: паэт чуе — але не ўслухоўваецца. Ён чуе толькі пярвічнае, самае «общеслышимое» — песню жаваранка, кукаванне зязюлі, гул машыны, шум ветру і г. д.

Да іншых недахопаў кніжкі «Поўня» трэба аднесці і невысокую часамі «тэхнічную» культуру верша. Там-сям наўмысна і не заўсёды ўдала ламаецца рытм вершаў. Жаданне паэта ў што б там ні стала раскаваць радок прыводзіць да таго, што ён расхліствае верш («У цягніку», «Пытанні», «Дзень патухае...» і інш.).

Ёсць неахайнасці і ў рыфмоўцы: двойчы «галовамі — галоўнае», двойчы «чакаю — чаканіць», двойчы «закасваю — сказана»; на шмуцтытул кнігі вынесены верш, у якім рыфмуюцца «турбот — любой», «імгненне — абпраменіць», «дабрата — дастаць». Наўрад ці трэба было б гэта рабіць.

Нарэшце, пра паэмы. Іх у кнізе — тры, і самая вялікая аб'ёмам і значная па задуме — «Проста — я». Аднак і яе, на мой погляд, нельга назваць удачай паэта. Як і вершы, яна нясе на сабе адбітак усіх вартасцей і недахопаў, уласцівых «проста» вершам. Можна, праўда, заўважыць, што ў паэме ёсць тое, чаго амаль няма ў вершах, — жаданне сказаць пра нешта вельмі істотнае, пра вайну і мір, пра чалавечнасць, праўду, пра адказнасць кожнага чалавека за лёс свету. Але ўсё гэта патанае ў звычайнай рыторыцы.

Лірычная «Паэма году твайго» (дарэчы, дасціпна задуманая і пачатая) і «Вяртанне ў лета» мне ўяўляюцца як спроба пяра, якое нацэлілася на стварэнне буйных паэтычных твораў.

Р. Тармола — увесь у станаўленні. Добрае (а яно, як мы пісалі ўжо, ёсць) вырасце і ўмацуецца толькі пры ўмове, калі паэт будзе як мага больш строга абдумваць кожны вобраз, кожную думку, кожнае слова. А гэта залежыць ад самога яго.

Фёдар ЯФІМАЎ.

Раман Тармола. «Поўня». Вершы і паэмы. Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1966.

АБАРОНЕНА Ў ВАРШАВЕ

Нашы чытачы ведаюць Аляксандра Баршчэўскага (Алеся Барскага) як паэта, аднаго з самых таленавітых і актыўных членаў літаратурнага аб'яднання пры беластоцкай «Ніве». Але ён займаецца і навуковай працай.

Нядаўна ў Варшаўскім універсітэце Аляксандр Баршчэўскі абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Творчасць Якуба Коласа 1906—1930 гадоў». Праца напісана пад кіраўніцтвам прафесара Уроцлаўскага універсітэта Мар'яна Якубца.

ДА ВЯЛІКАГА СВЯТА

У мастацкай майстэрні Аршанскага льнокамбіната ідзе актыўная падрыхтоўка да 50-годдзя Савецкай улады. Мастакі і дэсінатары распрацоўваюць эскізы і кампазіцыі для новых вырабаў і тканін з лёну.

Вялікую дапамогу майстэрні аказвае Саюз мастакоў БССР. Ён выдаў камандзіроўку ў Дом творчасці ў г. Хосту мастаку майстэрні Аляксандру Волкаву. Ён хутка прадставіць на разгляд камісіі некалькі варыянтаў кампазіцый для дэкаратыўнага насценнага пано, прысвечанага юбілею. У выразным дэкаратыўным вырашэнні мастак паказаў шлях, які прайшлі савецкія людзі за 50 год. Пэўная графічнасць вырашэння кампазіцыі, што абумоўлена тэхнікай выканання і матэрыялам, надае дакладную выразнасць. Пано прапануецца аўтарам для ўпрыгожання сцен клубаў, дамоў культуры, выставачных залаў і павільёнаў.

Над юбілейнымі кампазіцыямі працуюць і іншыя мастакі майстэрні. Так, мастак А. Мішкін рыхтуе эскізы белага абруса для юбілейнага стала. Дэсінатар А. Лыкава займаецца распрацоўкай праекта дэкаратыўнага ручніка з выкарыстаннем беларускага нацыянальнага арнаменту і ўзораў народнага ткацтва.

В. ФУРМАН.

ПЕРАД ВАМІ ЗДЫМАК М. Ананьіна, які называецца «Мост Шаблоўскага». Па гэтым мосце ў векапомным сорак першым фашысты гналі групу палонных савецкіх воінаў і мірных грамадзян. Сярод іх былі цяжка паранены легендарны капітан Шаблоўскі і яго сям'я—жонка і дзеці. Капітан вырашыў лепш загінуць, чым быць у варожым палоне. І калі калона праходзіла гэты мост, ён кінуўся ў ваду. А за ім іншыя байцы. Фашысты пастралялі герояў, якія не хацелі стаць на калені перад ворагам.

Здымак узяты намі з буклета «Брэсцкая крэпасць», які неўзабаве будзе выпушчаны ў свет выдавецтвам «Беларусь». Буклет — невялікі альбом кішэннага фармату. У ім больш шасцідзесяці старонак, некалькі дзесяткаў фотаздымкаў, зробленых А. і М. Ананьінымі, А. Велікасельцам, Я. Макарчуком. Аўтар тэксту — удзельнік абароны Брэсцкай цытадэлі Алесь Махнач.

Буклет расказвае пра Брэсцкую крэпасць, пра яе абарону, пра ўдзельнікаў слаўных баёў, якія па-геройску загінулі, і пра тых нямногіх, што засталіся ў жывых.

Знаёмячыся з гэтым своеасаблівым выданнем, мы нібы робім экскурсію—ад Холмскіх варот, ля якіх павёў байцоў у першую контратаку Самвел Матэвасян, да ўсіх асноўных участкаў абароны—Цэнтральнага вострава, Цярэспальскага, Кобрынскага, Валынскага ўмацаванняў крэпасці над Бугам.

Выданне гэтае — масавае, тыраж — сто тысяч. Адрэдагаваў тэкст М. Цімошак. Вокладку, тытул і макет зрабіў мастак А. Яўменаў.

ЮБІЛЕЙ СЯБРА

У старажытным Львове, на вуліцы Астроўскага, жыве шчыры сябра беларускай культуры, акадэмік, доктар гістарычных навук Іван Пятровіч Крыпякевіч.

У 1909 годзе адразу ж пасля выхаду ў свет кнігі «Адраджэнне беларускага пісьменства» І. С. Свянціцкага, аднаго з першых беларусазнаўцаў на Галіччыне, ён выдаў брашуру «Білоруси». У ёй упершыню на Украіне надрукаваны пераклады вершаў Янкі Купалы «А хто там ідзе?», «Памяці Шаўчэнкі». Брашура знаёміла шырокія колы украінскіх чытачоў з Беларуссю аж ад XIV стагоддзя. Аўтар расказаў пра беларускага патрыёта Васіля Цяпінскага, першадрукара Ф. Скарыну, пазнаёміў з творчасцю нашага першага нацыянальнага паэта Ф. Багушэвіча.

Адна з галоўных думак гэтай книжкі — гістарычная еднасць двух народаў-братоў. «У беларусах, — пісаў аўтар, — знайшлі мы, украінцы, шчырых сяброў і суседзяў. І не магло быць інакш. Амаль усю мінуўшчыну перажылі мы разам з беларусамі... Ніколі не было між абоімі народамі ніякай нязгоды»...

Зараз кніжка «Білоруси» знаходзіцца ў Музеі Янкі Купалы.

І ў далейшым І. П. Крыпякевіч не перастае цікавіцца Беларуссю. Так, у 1917 годзе выходзіць яго праца «Багдан Хмяльніцкі і пінская шляхта», у 1929 годзе — «Вольны порт» у Старым Быхаве 1657 г.» Ён перакладае на украінскую мову «Дыярыуш» Афанасія Філіповіча, збірае звесткі пра «Беларускі (Чавускі) полк», які быў сфарміраваны на тэрыторыі Мінскага і Мсціслаўскага ваяводстваў пад час вайны з Польшчай 1654—57 гг. Тут пададзены цікавыя звесткі пра кіраўнікоў беларускіх казакаў — Івана Залатарэнку, Мацвея Старынскага, «беларускага, магілёўскага і гомельскага» палкоўніка Нячая.

25 чэрвеня спаўняецца 80 год з дня нараджэння І. П. Крыпякевіча, даўняга сябра Беларусі. Хочацца шчыра павіншаваць яго са слаўным юбілеем!

С. ПАНІЗНІК.

Надрукавана ў «ПОЛЫМІ»

АДКРЫЦЦЁ НОВАГА ІМЯ

Якія толькі эпітэты не прыкладваліся да імя Арцёма Вярыгі-Дарэўскага ў гады, калі ў беларускім літаратуразнаўстве даваў сябе знаць вульгарны сацыялагізм! Адны залічалі пісьменніка да рэакцыянераў. Другія параўноўвалі яго нават са славутым рэнегатам Фадзеем Булгарыным. І, мабыць, гэта рабілася не наўмысна, а таму, што вельмі ўжо мала было вядома фактаў пра жыццё і творчасць Вярыгі-Дарэўскага. А чым менш вядома фактаў, тым лягчэй падвесці пісьменніка пад адвольную рубрыку... Побач з тым раздавалися і скептычныя галасы: хіба варта браць Вярыгу-Дарэўскага ўсур'ёз?! Ну, напісаў два-тры беларускія вершы, якія да таго ж вядомы пераважна ва ўрыўках. Ну, здаецца, быў за штосьці сасланы ў Сібір... Праўда, у сваёй кнізе «Аб літаратуры братніх славянскіх народаў» А. Кіркор у свой час указваў, што Вярыгу-Дарэўскаму належаць многія беларускія творы, належыць пераклад на беларускую мову «Конрада Валенрода» А. Міцкевіча. Ды паколькі саміх твораў нідзе не было, узнікала сумненне, што па даўнасці Кіркор крыху наблытаў...

Але вось у 4-м і 5-м нумарах «Полымя» за гэты год Генадзь Кісялёў апублікаваў даследаванне «Арцём Вярыга-Дарэўскі. З гісторыі літаратурнага Віцебска». І ўсім стала відно: гэта быў пісьменнік, якога трэба ставіць побач з Дуніным-Марцінкевічам, а ў некаторых адносінах, як рэвалюцыянера, нават вышэй. Як сведчаць знойдзеныя Г. Кісялёвым пісьмы да А. Кіркора, А. Кажанёўскага і іншых сучаснікаў, «наддзвінскі дудар» Вярыга-Дарэўскі пісаў на беларускай мове многа і плённа. І не віна пісьменніка, а бяда, што ўсё напісанае ім у тыя змрочныя часы ніяк не ўдавалася надрукаваць і,відаць, загінула ці мо чакае яшчэ свайго адкрывальніка ў архівах. Гэта — «Гутарка з пляндроўкі па зямлі латышскай», «Паўрот Міхалка», паэма «Ахульга», п'есы «Гордасць», «Хціваець», «Грэх 4-ты гнеў» і многае іншае.

Вялікую цікавасць мае і славуты «Альбом» Вярыгі-Дарэўскага. Па апісаннях і копіях ён быў вядомы і раней, але Г. Кісялёў знайшоў сам арыгінал, які доўгі час лічыўся загінуўшым. У гэты «Альбом» упісалі свае творы лепшыя людзі тагачаснай Літвы і Беларусі — Дунін-Марцінкевіч і Сыракомля, Каратынскі і Вуль (Карафа-Корбут). Многія з запісаў зроблены на беларускай мове. З працы Г. Кісялёва відаць, што «Альбом» быў своеасаблівай эстафетай, якая перадавалася з рук у рукі і аб'ядноўвала патрыятычныя і рэвалюцыйныя сілы Вільні і Мінска, Віцебска і Магілёва.

Літаратуразнаўчая праца Г. Кісялёва чытаецца як добрая, захапляючая белетрыстыка. Аўтар умее заінтрыгаваць чытача, зацікавіць яго сваімі архіўнымі пошукамі, сваімі сустрэчамі з жывымі нашчадкамі гістарычных асоб. Перад намі новы для беларускай літаратуры жанр—займальнае літаратуразнаўства, і тут Г. Кісялёў ідзе ў добрыя сляды за І. Андронікавым. З асаблівым напружаннем чытаюцца старонкі, прысвечаныя рэвалюцыйнай дзейнасці Вярыгі-Дарэўскага, які быў адным з кіраўнікоў паўстання 1863 года на Віцебшчыне. Царскія ўлады прыгаварылі пісьменніка да васьмі год каторжных работ у Сібіры...

Цяжка пераказаць нават найбольш істотныя моманты працы Г. Кісялёва. Тонка і аргументавана адказвае даследчык на пытанні, ці мог Вярыга-Дарэўскі быць аўтарам паэмы «Тарас на Парнасе» і чаму такое меркаванне ў свой час выказаў віцебскі фалькларыст А. Маркс. Услед за польскім гісторыкам М. Янікам прыводзяцца звесткі аб сібірскім «імённіку» беларускага пісьменніка. Упершыню публікуюцца вялікія цытаты з яго верша «Літвінам, запісаўшымся ў мой Альбом на пажагнанне», які захоўваецца ў вільнюскага літаратара Я. Шутовіча. Устанаўліваюцца факты біяграфіі паплечніка Вярыгі-Дарэўскага—беларускага паэта і рэвалюцыянера Ялегіша Пранціша Вуля (Карафы-Корбута). У адным толькі хочацца істотна дапоўніць Г. Кісялёва: пішучы пра выдадзеную ў Магілёве польскую паэму Вярыгі-Дарэўскага «Гутарка аб Сваяку», ён адзначае, што адшукаць гэтае выданне яму не давялося. «Гутаркі аб Сваяку» не знайшоў у польскіх бібліятэках таксама М. Канапацкі. І гэта не дзіўна: пасля паўстання 1863 года кніга была канфіскавана. Адзін экземпляр «Гутаркі аб Сваяку» (з паметкамі цэнзара) мне ўдалося адшукаць у аддзеле рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі АН Літоўскай ССР. Гэтая паэма, падзеі якой адбываюцца пераважна ў Мінску, прасякнута свабодалюбівымі ідэямі і пераканаўча сведчыць аб рэвалюцыйна-дэмакратычных поглядах яе аўтара.

Да Г. Кісялёва многія пісалі пра Вярыгу-Дарэўскага—і Я. Карскі, і М. Гарэцкі, і Д. Васілеўскі, і І. Бас, і М. Канапацкі (на яго, на жаль, у працы спасылкі няма), і А. Семяновіч, і аўтар гэтых радкоў. Але то былі пераважна выступленні па прыватных пытаннях жыцця і творчасці «наддзвінскага дудара». У даследаванні ж Г. Кісялёва Вярыга-Дарэўскі паўстае перад намі на ўвесь рост—як пісьменнік, рэвалюцыянер, грамадскі дзеяч, асветнік. Па сутнасці, у гісторыі беларускай літаратуры XIX стагоддзя нанава адкрыта яшчэ адно слаўнае імя, вартае нашай памяці і павагі.

Адам МАЛЬДЗІС.

На ўвесь свет славіцца Беларусь прыгажосцю сваіх пейзажаў. Кожны куточак рэспублікі мае сваю адметнасць. Вельмі прыгожы і старажытны Нясвіж. Тут часта бываюць мастакі, занатоўваючы аблічча горада і яго ваколіц. Сёлета на практычныя заняткі сюды прыехалі на цэлы месяц навучэнцы Мінскай рэспубліканскай школы-інтэрната па музыцы і выяўленчаму мастацтву. Фотакарэспандэнт Ю. Захараў сфатаграфаваў будучых мастакоў на эцюдах у ваколіцах возера Іванава.

У ГАСЦЯХ У РАБОЧЫХ

Работніцы Віцебскай швейнай фабрыкі сардэчна сустрэлі сваіх гасцей — артыстаў Рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага. Народная артыстка БССР Г. Абуховіч расказала швейніцам аб рэпертуарным плане тэатра, аб тым, што рыхтуе калектыў да 50-годдзя Савецкай улады.

Многія работніцы пабывалі ўжо на спектаклях горкаўцаў. На фабрыку артысты прывезлі канцэртную праграму. Выконваліся ўрыўкі з драматычных твораў, вершы, песні. Гледачам спадабаліся выступленні М. Сокала, Г. Абуховіч, А. Шкапскага.

Такая ж сустрэча адбылася ў артыстаў з работніцамі фабрыкі «КІМ».

І. ЛІСНЕЎСКІ.

Міхась БЛІСЦІНАЎ

У аснове маёй аповесці толькі факты—жорсткія, часам нават малаверагодныя. Але гэта сённяшні дзень славутага «новага свету», дзе культ «жоўтага д'ябла», расавая нянавісць даводзяць грамадства да цывілізаванага дзікунства.

АУТАР.

СТАРОНКІ З АПОВЕСЦІ «КРЫЖЫ І РУЖЫ»

Бірмінгем грымеў. Бірмінгем палаў, крычаў усімі колерамі электрычных і неонавых рэклам. Над горадам, асабліва над яго цэнтрам, стаяла зарыва агню. У начным небе прадавалася, здаецца, усё — мажлівае і немажлівае: ад патэнтаваных таблетак супраць венерычных захворванняў да казачных рудных плантацый на далёкай Венеры. І толькі ў зялёных артэрыях горада, на бульварах і парк-авеню панавала адносная цішыня: тут прадавалася толькі любоў.

Над вялізным будынкам універмага — на поўны рост электрычная постаць чалавека, які мяняе ўвесь час гарнітуры: то зялёны, то жоўты, то чорны або нават чырвоны. З вышыні сёмага паверха другога дома, быццам Ніягарскі вадаспад, струменіць неонавае пепсі-кола. А на рагу бульвара высокі каляровы фантан-рэклама флярыдскага шампанскага. Аўтамабілі, бюстгальтары, панчохі, капелюшы, футры, земляныя арэхі, цыгарэты «Кэмл»... Рэклама, рэклама, рэклама...

Патрык не любіў хадзіць пешшу. Без аўтамашыны ён адчуваў сябе бездапаможнай маленькай пылінкай у гэтым моры гукаў і руху. Але начны горад вельмі вабіў яго сваім непаўторным хараством, якое можна было зразумець толькі тады, калі з галавою акунешся ў жывы паток, калі будзеш дыхаць адным паветрам з усім, што рухаецца па вуліцах.

Вяртаючыся з апошняй зборні бэрчыстаў, якая адбывалася гэтым разам на Пенсільван-авеню, 107, на віле Джэка Бонда—аднаго з мясцовых фюрэраў арганізацыі, Патрык рашыў прайсціся пешшу па начным горадзе. Аўтамабільны рух ужо заціх, меней людзей стала і на тратуарах, але на скрыжаваннях вуліц, ля кінатэатраў і бараў усё яшчэ было людна.

Бадзяліся тут ужо з большага толькі тыя, хто не надта быў знясілены дзённай працай і не меў патрэбы ўставаць на досвітку, каб ісці зноў на заробак хлеба надзённага. Бадзяліся тут і тыя, для каго ноч стала зручнейшым часам здабычы, альбо тыя бедалагі, якім наогул не было дзе прытуліцца. Апошніх няцяжка было адрозніць ад усіх іншых і па адзенні, і па панурым выглядзе, і па патухлым паглядзе, у якім былі толькі абыякавасць да ўсяго і поўная безнадзейнасць...

Да павароткі на сваю вуліцу Патрык падышоў якраз у той час, калі ля ювелірнага магазіна пачыналася нейкая заваруха. Гаспадар магазіна і некалькі прадаўцоў трымалі за рукі двух маладых неграў. Тоўсты, апаплексічнай камплекцыі гаспадар магазіна крычаў немым голасам:

— Злодзеі! Рабаўнікі! Трымайце іх!

Навокал збіраўся натоўп, як заўсёды прагны да сенсацыі.

— Укралі? Што ўкралі? Дзе ўкралі?—чулася з усіх бакоў.—Лі-інч!—І ў паветры замільгалі кулакі.

Рэзкі свісток палісмена трошкі сцішыў крыкі. Натоўп расступіўся.

— У чым справа?

Чырванатвары гаспадар выступіў уперад.

— Гэтыя нігеры, сяржант, хацелі абрабаваць мой магазін.

— Прашу гаварыць больш дакладна. Калі і як?

— Гэта няпраўда,—запярэчыў адзін з неграў, выціраючы кроў з твару.—Абсалютная хлусня.

Гаспадар замахаў рукамі.

— А-а, гэтыя злодзеі яшчэ адмаўляюцца! Я сачыў за імі, як толькі валацугі апынуліся ля вітрыны. Яны стаялі і глядзелі на каштоўнасці такімі вачыма, быццам збіраліся іх праглынуць.

— О-о-о...—загулі навокал.

— І тады я не вытрымаў, выскачыў на вуліцу, каб папярэдзіць злачынства.

— Гэта ўсё?—спытаў палісмен.

Нехта зарагатаў, пачуўся рэзкі свіст.

Патрык стаяў зусім непадалёку, калі палісмен загадаў неграм ісці з ім. Пратэстуючы супраць беспадстаўнага затрымання, старэйшы негр з невялічкай чорнай барадой павярнуўся ў той бок, дзе стаяў Патрык. Патрык скалануўся. Нешта знаёмае, недзе бачанае, але забытае мільганулася яму ў рысах твару гэтага негра.

Негры ўжо рушылі ў суправаджэнні паліцэйскага ва ўчастак, а Патрык усё стаяў ля магазіна. «Ды гэта ж Алан! Яго вочы, яго постаць, яго твар. Але ж Алан загінуў...» Не ведаючы чаму, Патрык раптам крыкнуў наўздагон адыходзячым:

— Ала-ан!

Ніхто не азірнуўся, аднак Патрыку здалося, што адзін з неграў нібыта сумеўся і павярнуў убок галаву. Але гэта, відаць, толькі здалося. Ці мала што можа прымроіцца ўначы!

І ўсё ж нават у пасцелі Патрык ніяк не мог забыцца на гэты імгненны позірк страшэнна знаёмых вачэй, як быццам гэта сапраўды былі вочы таго Алана, сына чорнай карміцелькі Дароці, з якім ён у маленстве часта гуляў употай ад усіх.

«От, чорт... Нездарма кажуць, што ноччу ўсе кошкі чорныя,—дакараў ён сам сябе, варочаючыся ў пасцелі і перабіраючы ў памяці ўсе падзеі адышоўшага дня.—Трэба было пайсці з паліцэйскім і высветліць дакладна, хто гэта такі! Няўжо гэта Алан? Але ж Алан загінуў у Карэі... А можа...»

...Выпадак ля ювелірнага магазіна і нечаканая сустрэча з Патрыкам яшчэ раз пераканалі Алана (а гэта быў сапраўды ён), што ні час, ні барада, ні новае імя і прозвішча не гарантуюць яму поўнай бяспекі. Тут, у Бірмінгеме, яго многія могуць пазнаць. І тады...

Юджын Брайн добра разумеў, што можа быць тады... Але не наведаць магілу сваёй маці ён не мог. Ён даўно ўжо збіраўся гэта зрабіць, адразу ж, як толькі стала вядома ў Селме аб яе гібелі, але ўсё ніяк не выпадала. І вось сёння—такі недарэчны выпадак... «Няўжо гэты гарбун мог пазнаць мяне?»—думаў малады негр, ідучы побач з палісменам.

Завярнуўшы на другую вуліцу, палісмен спыніўся. Цікаўныя, што колькі дзесяткаў метраў яшчэ ішлі за імі, адсталі.

— Што ж мне з вамі рабіць, хлопцы? Набіць вам морды ці не пэцкацца?—усміхнуўся палісмен, разглядаючы затрыманых.

— Мы ні ў чым не вінаваты, сэр. Паверце чэснаму слову, сэр.

Палісмен зарагатаў.

— Чэснае слова... Але ж і таму гарладзёру я ні на цэнт веры не дам. А ну—бяжыце, я вас лавіць не буду. Хутчэй, хутчэй, д'яблы! Не верыце? «Фэйр-плэй, бэбі»*.—І, штурхнуўшы аднаго ў спіну, дадаў:—На залатыя бранзалеты заглядацца не раю, жалезныя ўраз прыдбаць можаце.—Палісмен сплюнуў на тратуар і, пасвіствaючы, пацёхаю рушыў у процілеглы бок.

Сябры перабеглі вуліцу і, каб не трапляць больш нікому на вочы, звярнулі на менш людную Ферфілд-стрыт.

— Бываюць жа і сярод палісменаў людзі,—ціха сказаў Аланаў сябар, выціраючы рукавом пот з твару.

Алан некалькі хвілін ішоў моўчкі, нібы не дачуўшы таго, што сказаў сябар. Пасля з сумненнем працадзіў скрозь зубы:

— Відаць, бываюць, але вельмі рэдка.

□ □ □

У наступныя два дні Патрык разгарнуў кіпучую дзейнасць. Па некалькі разоў на дзень ён сустракаўся з Роулам, часта раз'язджаў з ім па магазінах, наведваўся ў Энслі, пыльны прыгарад, дзе знаходзіліся майстэрні Ган-клаба—галоўнай рэзідэнцыі паслядоўцаў Джона Бэрча. На іх ніхто не звяртаў увагі, бо, відаць, спецыфіка дзейнасці гэтага «паляўнічага» клуба была такою, што пэўная таямнічасць і замкнёнасць з'яўляліся тут справамі зусім будзённымі.

Дзін часта выходзіў у цэх, клікаў рыжага майстра Томаса, раіўся з ім, пасля надоўга зноў знікаў у гілярні.

Лета было ўжо на сконе. Але тут, на поўдні, высокае неба па-ранейшаму сінела над горадам — без хмурынкі, без воблачка; днём неміласэрна паліла сонца, і дрэвы млелі ад спякоты, лянівa апусціўшы долу голле, з пакручаным, заўчасна пажоўклым лісцем. Часам пралятала над горадам навальніца-сухавей з грымотамі і бліскавіцамі, аднак і яна не прыносіла жаданай палёгкі, бо вецер замест дажджу раскідваў над зямлёй толькі сухі, калючы, як шрот, пыл, прынесены немаведама адкуль, можа, з суседніх карбанатных далін Чорнага Пояса альбо нават з аблысеелых гарбоў Апалачскага ўзгор'я.

Ад'езд місіс Джэні ў Санта-Інесу, дзе ўжо з месяц, як быў зняты ў фешэнебельным атэлі «Барбара» дарагі двухпакаёвы нумар, некалькі разоў па розных прычынах адкладваўся. Джэні ніяк не магла выбрацца ў дарогу. Але ўрачы, адказныя за яе здароўе, прымусілі нарэшце кінуць усе справы і тэрмінова ляцець на курорт.

У дзень ад'езду маці на аэрадром Патрык з самай раніцы дзяжурыў у яе пакоях. Місіс Джэні нават даверыла яму на час лячэння некаторыя дробныя справы па кантролю за адміністрацыйным апаратам. Патрык празмерна мітусіўся, дапамагаючы камерыстцы, што ехала разам з Джэні, пакаваць рэчы ў чаманы, прычым камерыстка прыносіла рэчы, а ён іх пакаваў. Калі ж маці паскардзілася на нясцерпны галаўны боль, сам прынёс халодны кампрэс і таблеткі з хатняй аптэчкі. Сын так заўзята завіхаўся, стараўся чым-небудзь дапамагчы перад ад'ездам, што Джэні нават праслязілася.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

* чэсная тульня, хлопчыкі (англ.).



АДВЯЧОРАК НАД СВІСЛАЧЧУ.

Фота М. РУБІНШТЭЙНА.

МІЖНАРОДНЫ ТУРНІР ІМЯ ЧАЙКОЎСКАГА

ЭСКІЗЫ КОНКУРСУ

Тамара ГРУМ-ГРЖЫМАЙЛА, мастацтвазнаўца

Цяпер я добра ведаю: ёсць скрыпкі—інструменты і ёсць скрыпкі — чалавечыя галасы. Калі на сцэну залы імя П. І. Чайкоўскага ўпершыню выйшаў галандзец Хрысціян Бор—высокі, кволы юнак, амаль хлапчук, з жаночай грыўкаю валасоў на маленькай галоўцы — скрыпка ў яго руках здалася працягам яго самога, яго доўгіх прыгожых рук, з вялікімі асляпляльна белымі манжэтамі. Скрыпка Бора засерабрылася высокім, пяшчотным гукам, быццам да струн яе дакранаўся толькі адзін адзінюткі валасок смыка. І я падумала: «Як гэта прыгожа, якая чыстая крыніца скрыпічнай кантылены!» І слухала... Але далей гэтага прыгожага і чыстага гуку не адкрылася нічога. Мне здалося—у музыцы, якую ўзнаўляў Бор, не было эмацыянальных узлётаў, хваляванняў чалавечага сэрца. За холадам інструментальных інтанацый паўставала нейкае абстрактнае, аддаленае ад чалавека хараство. Быццам іграла адна скрыпка без чалавека.

Гэтыя цуды скрыпкі «без чалавека» паўтараліся на конкурсе не раз. То яны зіхацелі халодным серабром скрыпкі Рубена Агараняна, які не заўсёды ішоў далей захаплення гукам, то мроіліся ў пранізлівым і дакладным, як шпага вопытнага дуэлянта, смыку японкі Ёка Сата. Не, я не хачу сказаць, што ігра гэтых таленавітых пераможцаў цяжэйшага турніра нечым не задавальняла. Наадварот. Выкананне асобных твораў (напрыклад, Канцэрта Ціхана Хрэннікава ў Ёка Сата, п'ес Паганіні ў Агараняна) здзіўляла дасканаласцю і магло быць названа ўзорам скрыпічнага стылю. Але такая ўжо чараўнічая ўласцівасць скрыпкі — рэдка каго з выканаўцаў яна не схіляе да любавання сабою. Нават вопытных канцэртантаў, закончаных артыстаў Такога, скажам, як амерыканец Эрык Фрыдман, які так драматычна здаў «пазіцыі» на трэцім туры.

І быў яшчэ адзін, але зусім іншы скрыпач на конкурсе, «заварожаны» ідэальным гучаннем інструмента. Ён стаяў на сцэне моцна і спакойна, нібы алімпіец у бестурботным сузіранні, і смык яго нетаропка абдымаў кожную струну. Гэта быў савецкі скрыпач Алег Каган, які лепш за ўсіх выконваў на першым туры п'есы Чайкоўскага. Я не магла спачатку зразумець—у чым сакрэт уздзеяння гэтага моцнага і статычнага, на першы погляд, скрыпача? У чым сіла яго нетаропкага мыслення, пазбаўленага колькі-небудзь рэзкіх дынамічных зрухаў? І зразумела: у гэтай вернасці выканаўцы пачуццю супакою, у якім праступае цэласнасць характару, велічнае адчуванне хараства, такія блізкія стылю Чайкоўскага. І калі яны «падымаюцца» і ў поўнай меры «расцвітаюць», скрыпач можа напоўніць твор экспрэсіяй дзівоснай сілы і высакароднасці. Так адбылося на трэцім туры, калі Алег Каган выконваў Канцэрт Сібеліуса.

І ўсё-такі я чула ў руках Кагана зззяючую прыгожую скрыпку. Скрыпку ідэальнага інструментальнага голасу, які зачароўвае ўсіх.

Раптам прыйшло іншае: скрыпка загаварыла інтанацыямі голасу чалавека. Быццам апантаны смык разбіў вытанчанае люстэрка самалюбавання, што прытаілася дзесьці пад дэкаю. У струны хлынула жывая кроў, і забурліла жыццём сэрца. Ніводзін інструмент—толькі голас, мова чалавечая здольныя былі даць гэтулькі адценняў пачуцця. І прыгадаліся мне на дзіва простыя і дакладныя словы М. Чарнышэўскага—найвышэйшая пахвала артысту: у гуках яго інструмента чуецца чалавечы голас. Перад аўдыторыяй конкурсу Чайкоўскага іграў Віктар Траццякоў.

Адчуванне гэтага галоўнага ў ігры дваццацігадовага савецкага юнака—чалавечнасці—прыйшло не адразу. На першым туры я пачула мужнага, самаадданага скрыпача, які глыбока і дынамічна выконваў Баха, бліскуча імправізаваў Паганіні. На другім туры фантазія і паэтычнае пачуццё Траццякова разгарэліся яшчэ большым святлом. У Канцэрце Хачатурана кіпела складаная барацьба, у «Меланхалічнай серэнадзе» цвіло адухоўленае і трапяткое пачуццё кахання. Віртуозныя варыяцыі Паганіні, зззяючы ўсімі відамі вытанчанай скрыпічнай тэхнікі, напоўніліся ў руках Траццякова веліччу сапраўднага музычнага хараства. Але толькі на трэцім туры, калі скрыпач іграў з аркестрам, прыйшло гэтае адчуванне глыбокай чалавечнасці яго таленту. Але ў ім не было звычайнай «канцэртнасці», азарту віртуознай канкурэнцыі саліста з аркестрам. У ім не было абстрактнай, «інструментальнай» прыгожасці. Калі я слухала другую частку Канцэрта Чайкоўскага ў выкананні Траццякова, мне хацелася пад кожнай нотай напісаць словы. Гэта—як музычная драма, як опера, дзе спяваюць шмат дзеючых асоб—розных у сваіх характарах і праявах і звязаных адзінай канцэпцыяй музычнай драматургіі.

Пранізлівы і горды, чалавечнейшы голас скрыпкі Траццякова перамог усе іншыя «скрыпічныя» галасы. У гэтым я бачу пэўны мастацкі сімвал.

На конкурсе імя Чайкоўскага прадстаўлены шырока рад буйнейшых сучасных інструментальных школ і перш за ўсё савецкая, амерыканская, японская, французская. Унутры гэтых школ, зразумела, змагаюцца свае плыні.

Хто ж і чаму сёння перамагае?

Нам цікавы і радасны прыход на міжнародную эстраду японскіх майстроў смыка. Толькі ў апошнія дзесяцігоддзі, па сутнасці, адкрылі для сябе японцы новую перспектыву творчасці ў інструментальным выкананні. І сёння векавая, танчэйшая і маляўнічая японская культура жывапісу і ювелірных рамёслаў нібы пераліваецца ў майстэрства інструменталістаў. Яна нараджае розныя індывідуальнасці—як правіла, тэмпераментнага, эмацыянальнага складу. Японцам блізкая лірычная крыніца музыкі. І, як нямногім іншым, ім блізкі стыль Чайкоўскага. Выкананне японскай скрыпачкай Мусукай Усіодай твораў Чайкоўскага стала своеасаблівай мастацкай кульмінацыяй конкурсу. Сапраўды—паэтычнейшы, гнуткі, чароўны смык, які пазнаў тайну «бясконцай мелодыі»! Усіода выключна гарманічная ў сваім элегічным стылі, але, бадай, толькі ў гэтым стылі, які «гладзіць» струны, але ніколі не «сячэ», не «хвошча» іх. У нечым, у гэтым нязменным араматным харастве скрыпкі Усіоды—аднабаковасць яе мыслення.

Але вось у апошні дзень конкурсу віяланчэлістаў выступае з аркестрам Кен-Іціра Ясуда, і гэты дзень становіцца новай перамогай японскай школы. Такіх хваляў трагічнага гучання віяланчэльнай музыкі Дворжака і Чайкоўскага не ўпомняць сцены Вялікай залы кансерваторыі. Маленькі японец абдымаў сваю вялікую віяланчэль, як дзіця, якое плача, і спяваў затоена і самааддана сваю трывогу, сваю драму. Такой глыбіні, такой адкрытай, свабоднай экспрэсіі не далі нават амерыканскія віяланчэлісты, нягледзячы на схільнасць некаторых з іх да вострых эмацыянальных перабольшанняў, нягледзячы на шчодры, абаяльны талент Стэфана Кейтса, які атрымаў заслужаны прыз. (Я не выпадкова гавару іменна пра амерыканскую школу, бо праявы—побач з «рацыяналізмам» — яе бурнага «рамантызму», напоўненага часта крайнасцямі і выдаткамі густу, мы бачым на кожным конкурсе). Чалавечнейшы драматычны талент Ясуды-выканаўцы стаў адным з самых каштоўных заваёў маскоўскага конкурсу. Але трэба праўду сказаць, на наш «еўрапейскі» густ сякія-такія эмацыянальныя адкрыцці Ясуды ўсё ж здаваліся залішне аголенымі. І ў гэтым сэнсе бездакорную па густу, па асаблівай цнатлівасці і сур'ёзнасці тону ігру савецкай віяланчэлісткі Карынэ Геаргіян (якая вызначаецца пры ўсім гэтым багаццем эмацыянальнага почырку) можна назваць узорам мастацкага стылю.

Сэрца музыкі—паэзія. Паэзія — адкрыццё новага духоўнага хараства. Наш конкурс імя Чайкоўскага адкрывае і заахвочвае лепшае, што ствараецца маладой паэтычнай думкаю ў сучаснай выканаўчай творчасці, думкаю, глыбока чалавечнай, глыбока змястоўнай.

У гэтым і заключаецца сімвалічны сэнс і мастацка-этычнае значэнне перамогі «чалавечай» скрыпкі Віктара Траццякова і іншых яго таленавітых таварышаў па конкурсу.

АДН.

ФІЛЬМЫ ПРА САВЕЦКУЮ МОЛАДЗЬ

26 чэрвеня ў нашай краіне адзначаецца Дзень савецкай моладзі. У сувязі з гэтым святам у гарадах і вёсках рэспублікі арганізаваны шырокі паказ кінафільмаў, прысвечаных жыццю і працы савецкіх юнакоў і дзяўчат.

Будуць дэманстравацца, у прыватнасці, мастацкія кінакарціны «Балада пра салдата», «Маладая гвардыя», «Вецер», «Добраахвотнікі», «Вышыня», «Чакайце пісем», «Сям'я Ульянавых», «Першая Бастылія», «Ім было дзевятнаццаць», «Трывожная маладосць», «Павел Карчагін», «Камсамольск», «Расказы пра юнацтва», «Добры дзень, гэта я!», «Таежны дэсант».

На экраны кінатэатраў выпушчана таксама новая мастацкая кінааповесць «Чыстыя сажалкі», створаная рэжысёрам Аляксеем Сахаравым на кінастудыі «Масфільм» па сцэнарыі Бэлы Ахмадулінай. Карціна прысвечана моладзі перадваенных год, тым, хто недажыў, недакахаў і загінуў, абараняючы Радзіму. У фільме здымаліся Аляксандр Збруеў, Яўгенія Філонава, Людміла Гладунко, Тамара Сёміна, Святлана Святлічная, Уладзімір Яўстаф'еў.

У гэтыя дні на экранах рэспублікі шырока дэманструюцца тансама хранікальна-дакументальныя і навукова-папулярныя кінастужкі «Маладосць вядзе», «Нашы сучаснікі», «Мы—рабочы народ», «Героі нашага часу», «Спартыўнае юнацтва», «На будоўлях—моладзь», «Сын салдата», «Вам, дваццацігадовыя», «Так яны вучацца», «Енісейскі сшытак», «Вуліца смелых», «Вартавыя міру» і іншыя.

Р. КОСЦІН.

ФЕСТЫВАЛЬНЫЯ КАНЦЭРТЫ

Работнікі культуры Калінкавіцкага раёна ўключыліся ва ўсесаюзны фестываль агляду творчых калектываў, прысвечаны 50-годдзю Вялікага Кастрычніка. Мэта яго — паказ дасягненняў у развіцці народнага мастацтва, паляпшэнне абслугоўвання працаўнікоў вёскі канцэртамі мастацкай самадзейнасці, выяўленне лепшых танцораў, спевакоў, чытальнікаў.

Асабліва актыўна выступае самадзейны калектыў Лясецкага сельскага клуба (загадчык Васіль Змушка). Яго ўдзельнікі далі канцэрты ў гарадскім пасёлку Азарычы, у вёсках Казловічы, Залатуха, Ліпава. Навасёлкі, выязджалі ў Светлагорскі раён.

Ю. ПОЛЯК.

ДЗІКІ АМЕРЫКАНЕЦ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

Праводзіць місіс Джэні на аэрадром прыехала некалькі паважных асоб, картэж іхніх лімузінаў меў даволі салідны выгляд. «Пантыяк», у якім ехала Джэні, вёў сам Патрык.

Калі прыбылі ў аэрапорт, белакрылы лайнер ужо стаяў ля эстакады. Пасажыры вясёлымі, гаманлівымі чародкамі таўкліся ля выхаду на лётнае поле, чакаючы пасадкі.

Урэшце, калі былі пагружаны рэчы і дазволілі пасадку, усе рушылі к трапу.

Джэні развіталася з прысутнымі, выслухала пажаданні шчаслівай дарогі, пацалавала сына.

— Будзь разумны, мой хлопчык. Трымай сябе прыстойна.

— Можаш не турбавацца, ма. О кэй! Шчаслівай дарогі!

Лайнер падняўся ў паветра і, зрабіўшы разварот над аэрадромам, узяў курс на захад.

Патрык доўга махаў рукой, хапя маці ўжо і не магла яго бачыць. Ён адчуваў сябе лёгка, бесклапотна, быццам пасля заканчэння цяжкай работы. Толькі недзе глыбока ў душы мімаволі гнездзіўся неспакой, адчуванне спустошанасці і, можа, нават страху. Страху? Але чаму страху? Усё абышлося гэтак добра. А ўсё ж...

Захапелася выпіць, пабыць аднаму, падумаць.

Бар Дэйла Хіпса, ля якога Патрык прыпыніў сваю машыну, у гэты час дня меў зусім будзённы выгляд: ні музыкі, ні зыркага святла, дый людзей за століямі толькі дзе-нідзе. Бармэн драмаў за стойкай, лена цікаючы з-пад прымружаных павек за наведвальнікамі.

Патрык сеў за столік ля акна і заказаў падвойную порцыю віскі.

Уздоўж сцяны, улева ад уваходу ў бар, паблісквалі нікеляванымі бакамі слот-машыны. Кожны з наведвальнікаў, укінуўшы 5—10-цэнтавую манету, меў магчымасць паказытаць свае нервы марай за некалькі цэнтаў нечакана разбагацець. Аднак слот-машыны, што падпільноўваюць даверлівых прасцякоў балай што на кожным кроку, прымаючы ў свае ненажэрныя чэравы манеты, не вельмі спяшаліся ашчаслівіць сваёй шчодрасцю прэтэндэнтаў на тэты спакус. Багацелі не тыя, хто кідаў цэнты, а тыя, хто выграбаў іх.

Спакусіўся паспрабаваць шчасця і малады Баркгільтон. Пакуль неслі заказ, ён паспеў выйграць за 20 цэнтаў пяцідзесятавую бурштынавую памаду для вуснаў.

Пасля падвойнага віскі заказаў яшчэ порцыю. Выпіў. У галаве крыху закружылася.

...Пад крылом самалёта ляцела зямля: зялёныя, жоўтыя, чорныя плямы мільгацелі ў ілюмінатары, калі Джэні паварочвала галаву ўлева.

Вось віецца сярод зеляніны тонкая стужка. Гэта, відаць, Блэк-Уорыёр. Паўнаводная і суднаходная Блэк-Уорыёр—рака-працаўніца, па якой няспынна ідуць грузы з Бірмінгема ў порт Мабіл, зверху здаецца зусім малапрыкметнай ручаінай.

Пасажыраў у самалёце было сорак шэсць чалавек. Паважныя бізнесмены, старыя лэдзі, зусім юныя дзяўчаты і нават двое дзяцей: хлопчык і дзяўчынка. Дзяўчынка яшчэ зусім малая. Яна праз кожныя пяць хвілін пыталася:

— Скажы, мамачка, а бабуля нас будзе сустракаць ці не? Скажы, а? На машыне ці на самалёце?

— Будзе, будзе абавязкова,—у каторы раз адказвала ёй маці, яшчэ нестарая жанчына, што сядзела непадалёку ад Джэні. І, схіліўшыся да суседкі, папіху дадала:—Не ведае дурненькая, што няма ўжо ў яе бабулі. Ляцім на пахаванне.

Многія з пасажыраў драмалі. Пажылы чалавек у чорнай сутане часта прачынаўся, нервова ўскідваў галаву і кожны раз жагнаўся. Хударлявая высокая жанчына ў саламяным вастраверхім капялюшыку ўвесь час нешта жавала, даставала з кошыка і старанна каўтала, быццам тут, у паветры, рашыла пачаць папраўляцца.

Маторы гулі роўна, аднастайна. Пад крылом пракінулася шырокая стужка Місісіпі. Якою мізэрнай здаецца з вышыні і гэтая магутнейшая рака кантыненту, што нясе свае воды з поўначы на поўдзень, у Мексіканскую затоку, туды, дзе пад сонцам млее Фларыда! Джэні падумалася мімаволі, што можа і не варта было ляцець у Санта-Інесу, а лепей бы ў Фларыду, дзе ля возера Анічобі такія цудоўныя мясціны. Але ж урачы, урачы... Пераканалі, што на паўвостраве цяпер хвораму чалавеку не выпадае быць, што там стала вельмі неспакойна: усюды палігоны, пускавыя ракетныя станцыі, асабліва на мысе Канаверал, альбо як яго цяпер называюць—мысе Кенэдзі. А галоўнае—усюды гэтыя крыклівыя кубінскія ўцекачы, шалёныя кабальерас, ад якіх на мілю патыхае крывёю...

Ляціць унізе зямля. Хутка пачнецца Тэхас, затыканы, як сад саджанцамі, нафтавымі вышкамі. За ім—Нью-Мексіка, жоўта-зялёная Арызона, а там і Лос-Анжэлас... Ціхі акіян, сонца, спакой...

Роўна, надзейна гудуць маторы. Хочацца спаць... хочацца спаць...

...Патрык зірнуў на гадзіннік. Ужо без пяці дванаццаць. Засталося толькі дваццаць пяць мінут. Толькі дваццаць пяць. Разлічыўся за віскі, кінуўся да тэлефона. На званок ніхто не адказваў. Кінуў трубку, пайшоў к машыне.

У машыне стала крыху спакайней. Праехаўшы бяздумна некалькі вуліц, павярнуў на паркавую магістраль. Перад вачмі мільгалі светафоры: жоўты, чырвоны, зялёны... «Куды ехаць? За горад? А можа лепей дадому?» Уключыў радыё. Палілася музыка... Берлёз... К чорту Берлёза! Застаецца пятнаццаць... Хутчэй, хутчэй дадому. Замкнуцца і чакаць.

Праз некалькі хвілін ён быў ужо на вуліцы першага прэзідэнта. Паставіўшы машыну ў гараж, кінуўся праз цёмны ход наверх. Уключыў прыёмнік. Зноў музыка. Адчыніў дзверы і крыкнуў уніз:

— Кэт! Дайце кавы.

Рукі непрыемна дрыжаць. Сеў на канапу, стараючыся супакоіцца. «Няўжо зноў пачынаецца прыпадак? Спакойна, май фрэнд, трымацца, трымацца».

Кэт прынесла каву, запыталася:

— Місіс паляцелі?

— Вылецела.

На гадзіннику ўжо дванаццаць трыццаць пяць. Плача скрыпка Лізі Хард... Рэкламы, рэкламы... «Купляйце гігіенічныя шкарпэткі фірмы «Джым Фліка і сын»... «абязбольваючы прэпарат для цяжкарных... толькі ў Мэгі Палмер... толькі ў Мэгі Палмер... толькі ў Мэгі...» Дыктар раптам перапыніў перадачу рэклам і ўрачыста абвясціў: «Учора ў дэльце Меконг у часе высадкі падраздзялення 1-й авіядэсантнай дывізіі захоплен вялікі падземны склад зброі і шмат палонных. Малады сяржант Кліф Брокменшыфт адзін узяў у палон сем в'етконгаўцаў». І зноў скрыпка. К чорту ўсе скрыпкі! К чорту Лізі Хард! Няўжо зноў прыпадак? Толькі не зараз, толькі не зараз! Чаму настала цішыня? Неяк зусім нечакана змоўкла скрыпка. Свіст марзянкі, быццам пошум касмічнай мяцеліцы. «Увага! Слухайце! Слухайце!» І зноў цішыня. Патрык ускочыў з месца, утаропіў вочы ў зялёнае шкельца прыёмніка.

Урэшце дыктар на дзіва абыякавым голасам, быццам аб нечым зусім будзённым, абвясціў:

«Паветраная катастрофа над Арызонай. Як паведамляюць агенцтвы Асашыэйтэд Прэс і ЮПІ, сёння, 19 верасня 1964 года, у 12 гадзін 25 мінут па вашынгтонскаму часу ў сямі мілях ад Рыо-Грандэ-дэль-Нортэ над штатам Арызона пацярпеў аварыю пасажырскі самалёт «Сэйбр» № 09-47 авіякампаніі «Норт Амерыкэн авіэйшн». Самалёт ляцеў з Бірмінгема ў Лос-Анжэлас, маючы на борце сорак шэсць пасажыраў і шэсць чалавек каманды. Усе пасажыры і каманда загінулі. Вядзецца тэрміновае высвятленне прычын катастрофы. Новыя паведамленні з Арызоны, куды тэрмінова вылецеў наш спецыяльны карэспандэнт, будуць перадавацца неадкладна, як толькі будзе атрымана адпаведная інфармацыя, усімі радыёстанцыямі Злучаных Штатаў Амерыкі».

Патрык абмяк. Ён паволі асунуўся на дыван. Нервовае напружанне, у якім ён жыў, скончылася.

Званіў тэлефон—настойліва, пранягла. К чорту! К д'яблу! Намацаў кнопку званка. Неўзабаве прыбегла Кэт. Падняла з дывана, палажыла на канапу. Для яе такі стан Патрыка—з'ява звычайная. Нявыключанае радыё пачало паўторна перадаваць сенсацыю дня: «Паветраная катастрофа над Арызонай...» Кэт схапілася за галаву, пабялела.

— Ой, сэрца, гэта ж, здаецца, самалёт, на якім місіс... Сэр, сэр, выпіце валы... вам стане лягчэй, сэр.

Але «сэр» ужо апрытомнеў. Ён ляжаў яшчэ нерухома, незвычайная млявасць разлілася па ўсім целе, скавала рухі, аднак галава была зусім ясная.

— Не крычы, Кэт!

— Божа, божа... Што ж цяпер будзе?

Патрык прыўзняўся на канапе.

— Там у шафе бутэлька з віскі. Налі чарку, Кэт.

— Можа не трэба, сэр...

— Маўчаць! — у голасе ягоным пачулася пагроза. — Цяпер я твой паўнаўладны гаспадар і буду патрабаваць слухацца мяне без пярэчанняў. Усё, што загадаю... усё, што захачу...

— Кэт моўчкі наліла з бутэлькі.

Зноў зазваніў тэлефон. Кэт хацела зняць трубку, але Патрык закрычаў:

— Не трэба... Не падыходзь... Я не хачу... Я не хачу... Толькі не зараз, толькі не зараз. Звані, звані, хоць разарвіся... Ха-ха. Містэр Патрык Баркгільтон на званкі не адказвае... У яго няшчасце, ён застаўся адзін... Адзін сярод цэлай зграі... як дзік... дзікі... Чуеш, Кэт? Дзікі амерыканец... дзік. Ха-ха-ха.

Кэт паціху выйшла і прычыніла дзверы пакоя. Ёй стала страшна.

...Усе газеты назаўтра і ў наступныя два-тры дні былі запоўнены паведамленнямі аб грандыёзнай катастрофе ў небе над Арызонай. Пералічваліся ўсе, хто загінуў. Падаваліся іх біяграфіі, нават розныя пікантныя моманты асабістага жыцця. Шмат было меркаванняў, часам самых супярэчлівых і фантастычных, аб прычынах катастрофы. Некалькі дэпутатаў узнялі ў палаце прадстаўнікоў пытанне аб прыцягненні да адказнасці авіяцыйнай кампаніі. Дэбаты вяліся некалькі дзён, аднак ніякіх вынікаў не далі з-за абструкцыі правага крыла рэспубліканскай партыі, якая абвінавачвала партыю дэмакратаў і яе міністраў у адсутнасці пільнасці, нядбайстве і карупцыі.

Нарэшце, калі цікавасць і ажыятаж вакол гэтай падзеі пачалі ўжо спадаць, у друку з'явілася паведамленне ўрадавай камісіі, у якім канстатавалася, што, паволле дасканала праверaных і даследаваных матэрыялаў, катастрофа над Арызонай адбылася ад узрыву бомбы з гадзіннікавым механізмам, якая трапіла ў самалёт з рэчамі аднаго з пасажыраў.

А хто быў гэты пасажыр — ведалі толькі два чалавекі. Толькі два. Але яны маўчалі—на тое ў іх былі прычыны.

ДЫНАСТЫЯ БАЯНІСТАЎ

Пяць сыноў у Васіля Аляксеевіча Казлова — рабочага шклозавода ў Касцюкоўцы. І ўсе яны, як і бацька, захапляюцца музыкай. Старэйшы сын — Дзмітрый працуе выкладчыкам у мясцовай музычнай школе, Васіль кіруе хорам Дома культуры шклозавода. Уладзімір служыць у Савецкай Арміі, грае ў аркестры. Не адстаюць ад старэйшых братоў і малодшыя — Барыс і Слава. Яны таксама граюць на баяне.

Калектыў мастацкай самадзейнасці шклозавода запрошаны выступаць у Маскве на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі. Сярод удзельнікаў гэтага свята будуць і браты Казловы.

ГРАЮЦЬ САМАДЗЕЙНЫЯ МУЗЫКАНТЫ

110 артыстаў працуюць у калектыве. Можна падумаць, што тут гутарка ідзе ледзь не пра Вялікі акадэмічны тэатр оперы і балета. Не! Гэта — удзельнікі мастацкай самадзейнасці толькі аднаго Летчанскага сельскага клуба, што на Віцебшчыне. Удзень яны працуюць у мясцовым саўгасе «Краева», а вечарам прыходзяць у свой клуб, дзе займаюцца ў драматычным, харавым, танцавальным гуртках і інш.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

24 чэрвеня

Першая праграма. 16.55—праграма перадач. 17.00—для малодшых школьнікаў. «Лёвя-лянок» (М). 17.30—для малышоў. «Пеўнік і жорнаўкі». Мультыплікацыйны фільм. 17.40—рашэнні майскага Пленума ЦК КПСС—у жыццё. «Фабрыка вітамінаў». Пра саўгас «Любанскі», размешчаны на асушаных тарфяніках. 18.05—тэлевізійныя навіны. 18.20—«Спявае М. Мардасава» (М). 18.55—тэлевізійны стадыён Інтэрбачання. Перадача з Прагі. 19.40—французскі дакументальны кінанарыс (М). 20.00—«Эстафета навін» (М). 21.00 — «Майстры зарубежнай эстрады». Песні Шарля Азнавура. 21.45—рашэнні XXIII з'езда КПСС—у жыццё. «Дзённік пяцідгодкі». Расказ аб прадпрыемствах Мінска, якія перайшлі на новую сістэму планавання і кіравання. 22.15 — «Нуль-тры». Шырокаэкранны мастацкі фільм.

Другая праграма. 11.00—«Панарама Радзімы» (М). 11.30—для школьнікаў. Канцэрт (М). 12.15 — «Эканамісты за «круглым сталом» (М). 17.30—«Здароўе». Навукова-папулярная праграма (М). 18.00—тэлевізійныя навіны (М). 18.20—да 50-годдзя Савецкай улады. «Усесаюзны старастра». Дакументальны фільм. 19.00 — «Цыган». Спектакль Растоўскага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя М. Горкага.

25 чэрвеня

Першая праграма. 14.55—праграма перадач. 15.00—для школьнікаў. «Сустрача з Тэатрам юнага гледача» (М). 16.30—«Гуцульская легенда». Музычная навела. Перадача з г. Львова. 17.00—«Праграс». Тэлевізійны часопіс (М). 17.40—клуб кінападарожнікаў (М). 18.35—«Гаворыць камсамол». Фільм пра XV з'езд ВЛКСМ (М). 19.30—«На агеньчыку» (М). 20.30—тэлевізійныя навіны (М). 21.00—тэлевізійнае анко сатыры (М). 21.15—беларуская панарама. (Уключэнне Віцебска, Брэста). 22.15—«Двое». «Лясная казка». Кароткаметражныя фільмы. 23.00—«Залаты ключ». Конкурс Інтэрбачання на лепшую эстрадную песню. Перадача з Брацілавы.

Другая праграма. 18.00 — «900 незабыўных дзён». Дакументальны фільм. 18.50 — «Мой белы горад». Тэлевізійны спектакль. 20.20 — наш кінагодбус. «Маляўнічыя Пеніны». «Сустрачы ў Італіі». «Вострае вечнага лета—Цэйлон». Кінанарысы. 21.15 — «Праз дваццаць год». Мастацкі фільм (М).

26 чэрвеня

Першая праграма. 10.35—праграма перадач. 10.40—«Белыя і чорныя». Тэлевізійны шахматна - шашачны клуб. 11.10 — «Музычная шкатулка». 11.30—на III Міжнародным конкурсе імя П. І. Чайкоўскага (М). 12.20—для школьнікаў. «Рабі з намі, рабі, як мы». Перадача з ГДР. 14.20—праграма перадач. 14.25—«Талнах—халодная планета». Фільм Нарыльскай студыі тэлебачання. (М). 15.00—«Музычны кіёск» (М). 15.20—тэлевізійныя навіны (М). 15.30—для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Народжаныя лятаць» (М). 16.10—«Наш дзвіз — адзінства». Маладзёжная перадача (М). 16.45—для дзяцей. Г. Мамлін. «А з Алёшкам мы сябры». Спектакль Ленінградскага дзяржаўнага тэатра юнага гледача. У перапынку—«Крылатае племя». Кінарэпартаж пра авіяцыйнае свята. 18.35—«Знаёмыя мелодыі». Навіны музычнай фільматэкі. 19.20—да 50-годдзя Савецкай улады. «Спартыўныя новабудоўлі сталіцы». 20.00—па вашых просьбах. Канцэрт (М). 20.30—тэлевізійныя навіны (М). 21.30—«Спектр». Музычная праграма. Перадача з Балгарыі. 22.15—«Табе, юнацтва!». «Дзень заўтрашні» (М).

Другая праграма. 10.10—«Армія Трасагукі». Мастацкі фільм (М). 11.30—для дзяцей. «Чырвоная шапачка». Фільм-балет. 12.10—«Горад вольных майстроў». Тэлевізійны спектакль. 16.45—у афіры — «Маладосць» (М). 18.00—першынство свету па мотакросу. Перадача з Кішынёва. 19.00—літаратурны тэатр. Веркор. «Маўчанне мора» (М). 20.00 — «Голас юнацтва». Дакументальны фільм. 20.20—«Добраахвотнікі». Мастацкі фільм. 21.55—«На арэне—лялькі. Фільм-канцэрт.

Куток КАЛЕКЦЫЯНЕРА

ВЫДАТНЫЯ СПАРТЫЎНЫЯ ПАДЗЕІ ГОДА

У гонар матча на першынство свету па шахматах, дзе за шахматную карону змагаліся два мацнейшыя майстры планеты—Цігран Петрасян і Барыс Спаскі, Міністэрства сувязі СССР выпусціла спецыяльную паштовую марку. На фоне шахматнай дошкі адлюстраваны залаты медаль чэмпіёна свету па шахматах і дзве шахматныя фігуры—чорная і белая, упрыгожаныя лаўровай галінкаю. Пераважаючыя колеры: палевы, карычневы, залацісты. Малюнак падрыхтавалі мастакі Барыс Лебедзеў, Леанід Сяргееў і Марк Грынберг.

Намінал маркі — шэсць капеек, друк — плоскі. Зубцоўка — грабенчатая. Памеры жывапіснага поля — 32 на 32 міліметры.

□ □ □

Гэтыя ж тры мастакі з'яўляюцца аўтарамі выпушчанай серыі з чатырох марак. На першай з іх коштам у чатыры капейкі на фоне эмблемы першынства свету па футболу намаляваны кубак «Залатая багіня», футбольны мяч і лаўровая галінка. Марка выканана ў спалучэнні ружовых і залацістага адценняў.

Шасцікапеечная марка гэтай серыі мае на першым плане каляровыя аллюстрацыі футбалістаў на зялёным фоне сеткі зямнога шара. Савецкі футбаліст — у чырвонай майцы. Яго сапернік — у белай майцы са светла-карычневымі палосамі. Яны змагаюцца за мяч.

Абедзве маркі маюць надпісы: «Першынство свету па футболу», а каля малюнкаў: «Англія. 1966».

Астатнія дзве марні серыі прысвечаны першынству свету па фехтаванню. Паштовая мініяцюра коштам у 12 капеек мае аллюстраванне сеткі зямнога шара на бланітным полі. На гэтым фоне два фехтавальшчыкі.

16-капеечная марка, выкананая ў спалучэнні цёмна- і светла-фіялетавага, чорнага і залацістага колераў, таксама мае фонам сетку зямнога шара. На ёй — фігура фехтавальшчыка. Ніжэй — маска, рапіра і лаўровая галінка. Надпісы на абедзвюх марках аднолькавыя: «Першынство свету па фехтаванню». «Масква. 1966». Размяшчэнне надпісаў такое ж, як і ў першых дзвюх марках серыі.

Друк — плоскі. Зубцоўка — грабенчатая. Памеры жывапіснага поля — 32 на 32 міліметры.

ЗАСНАВАЛЬНІК РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ПАЭЗІІ АРМЕНІІ

У вялікім сузор'і шматнацыянальнай савецкай паэзіі яркай зоркай зяе творчасць Акопа Акапяна. Стагоддзе з дня нараджэння выдатнага рэвалюцыйнага паэта Арменіі (1866—1937) шырока адзначана ў Савецкім Саюзе.

На паштовай марцы, выпушчанай у гонар стагоддзя юбілею Акапяна, мастак Лідзія Пешкава ўзнавіла партрэт паэта, а справа ад яго — малюнак групы рабочых-дэманстрантаў, якія нясуць чырвоны сцяг. Гэтым мастак падкрэсліў рэвалюцыйную сутнасць неўміручай лірыкі армянскага паэта.

Партрэт Акопа Акапяна выкананы на зялёным фоне нацыянальнага арнаменту. Яго імя напісана на армянскай і рускай мовах.

Намінал марні — чатыры капейкі. Зубцоўка — рамачная. Друк—металаграфія і мецца-цінта. Гравёр — Іван Макравусаў. Памеры жывапіснага поля — 23,5 на 35,5 міліметра.

За апошнія гады Міністэрства сувязі СССР выпусціла некалькі марак, прысвечаных выдатным дзеячам Арменіі. Сярод іх паштовыя мініяцюры з партрэтамі Хачатура Абавяна, Саят-Новы, Егішэ Чарэнца, Месропа Маштоца.

Марыя КАВАЛЁВА. (АДН).

ГУМАР НАШЫХ СЯБРОЎ

ГАБРАЎЦЫ СМЯЮЦЦА

Тры балгарскія гарады — Габрава, Ямбол і Плевен—аспрэчваюць права называцца «сталіцай смеху». Нядаўна габраўцы абвявілі Дэкаду гумару, на якую прыехалі гумарысты з суседніх гарадоў, а таксама з Сафіі, Дранава, Тырнава і інш.

Часопіс «Балгарыя», дзе расказваецца пра ўсё гэта змяшчае нізку габраўскіх анекдотаў. Вось некалькі з іх.

АПОШНІ НАКАЗ

Адзін габравец рамантаваў дах і, паслізнуўшыся, сарваўся. Пралятаючы міма акна, ён крыкнуў:

— Жонка, сёння гатуй на аднаго менш!

РАСШЧОДРЫЎСЯ

Да аднаго габраўца прыйшлі госці. Пасядзелі, пагаварылі. Жонка шапнула яму:

— Прапануй гасцям чаго-небудзь прахаладжальнага.

— Зараз! — адказаў габравец і шырока расчыніў вокны.

ЗАНАДТА НІЗКА

Прыходзіць габравец у гасцініцу.

— Колькі бераце за ноч?

— За нумар на першым паверсе сто леваў, на другім — восемдзесят, на трэцім — шэсцьдзесят і на чацвёртым — сорак.

Габравец падумаў-падумаў і падаўся да выхаду.

— Хіба вы не застанецеся ў нас? — кінуўся наўздагон адміністратар.

— Не! Пашукаю гасцініцу вышэйшую.

ЗРУЧНЫ МОМАНТ

МУЖ: Ты ведаеш, Ч. прыпісалі дызту.

ЖОНКА: Якраз зручны момант запрасіць яго ў госці.

ХІТРУН

— За колькі ты давязеш мяне да вакзала? — спытаў габравец у рамізніка.

— За два левы.

— А колькі возьмеш за багаж?

— Нічога.

— Тады вязі багаж, а я пайду пешшу.

АКРАБАТЫ

Акрабаты закончылі свой нумар, і на арэну выйшаў клоун Бамбіна. Дакладней кажучы, не выйшаў, а ўваліўся. Гледачы віталі яго смехам адабрэння. Потым клоун выдатна паказаў велагоншчыка. Асабліва, аднак, спадабалася публіцы, як Бамбіна парадзіраваў дыскабола. Кінуўшы ўяўны дыск, ён ніяк не мог устаяць на адной назе і пры агульнай радасці выцягваўся на ўсю даўжыню на пілавінні. А калі ў заключэнне ён абабег арэну як стаер, прыстукваючы сябе пяткамі ніжэй спіны, праводз